

ШКОЛА...
ГОД
2134-Ы...
ЧЫРВОНКА

У ПРАЦАДАЎЦЫ
ДЛЯ ВАС –
45 СЕКУНД...
ЧЫРВОНКА



Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 СТУДЗЕНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 9 (29123)

## ЛІЧБА ДНЯ

**78 330**

*асабовых дэпазітных рахункаў на сямейны капітал на 1 студзеня адкрыта ў Беларусі. Менавіта столькі шматдзетных сем'яў скарысталася гэтай магчымасцю. На іх рахункі залічана 783,3 млн долараў. У тым ліку ў 2019 годзе адкрыты 15 461 рахунак на агульную суму 154,61 млн долараў. З 1 студзеня 2020 года сямейны капітал устанаўліваецца ў памеры 22 500 рублёў і прызначаецца пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) у перыяд з 1 студзеня 2020 года да 31 снежня 2024 года трэцяга або наступных дзяцей. А з 1 студзеня 2021 года памер сямейнага капіталу штогод будзе індэксавацца з нарастаннем выніку на велічыню індэкса спажывецкіх цэн за папярэдні год для захавання пакупной здольнасці. Новы памер сямейнага капіталу дзейнічае на працягу каляндарнага года.*

# РУКАЛА З «РУДАКОВА»



Фота БелТА.

У цяпліцах унітарнага прадпрыемства «Рудакова» Віцебскага раёна ўжо сабралі першы ўраджай агуркоў і зялёніва. 10 тон зялёных «ягад», а таксама кроп, пятрушка, салата, базілік і рукала ўжо паступілі ў крамы абласнога цэнтра. **НА ЗДЫМКУ**: аграном Вольга КАНСТАНЦІНАВА.

## КОРАТКА

- **Вытворчасць сельгаспрадукцыі ў 2019 годзе вырасла на 2,9 %.**
- Урад Расіі падаў у адстаўку.
- **За дзесяць дзён студзеня вырашылі размарозіць сямейны капітал больш за 440 сем'яў з Мінска.**
- Заяўкі на ўдзел у нацыянальным адборы на «Еўрабачанне-2020» прымаюцца да 17 студзеня.
- **Пасажырапаток мінскага метро ў 2019 годзе вырас больш чым на 10 мільёнаў чалавек.**
- Таццяны 25 студзеня змогуць бясплатна наведаць канцэрт віцебскай філармоніі.
- **У Пінску ўвялі карантын з-за шалёных жывёл.**
- У Беларусі абмяжоўваюць гандаль нетытунёвымі жавальнымі сумесямі з нікацінам.

ISSN 1990 - 763X

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# ВЫРАТАВАЦЬ ЗАМАК

### У Нясвіжы прайшлі маштабныя вучэнні МНС

**Дзевяць месяцаў таму ўвесь свет абышлі кадры з Парыжа, на якіх быў зняты палаючы сабор Парыжскай Божай Маці. А крыху больш чым сямнаццаць гадоў таму Беларусь ледзь не страціла адну са сваіх найвялікшых культурных славутасцяў — Нясвіжскі замак. У ноч на каталіцкае Раство 2002 года ў нашых ратавальнікаў быў свой «Нотр-Дам».**

Яўген Язвінскі цяпер працуе інжынерам па пажарнай бяспецы Нясвіжскага палацава-паркавага ансамбля. Шаснаццаць гадоў таму ён быў начальнікам дзяжурнай змены ў пажарна-выратавальнай часці № 1 Нясвіжа.

СТАР. 4



Фота МНС.

Кузня чэмпіёнаў

# «ВУЧНІ — МОЙ ТВАР»



Васіль Адамавіч з жаночай зборнай па пяцібор'і.

**Пра сакрэты выхавання паспяховых спартсменаў расказвае старшы трэнер нацыянальнай каманды па пяцібор'і Васіль ГУЛЕВІЧ, удастоены прэміі «Беларускі спартыўны алімп»**

СТАР. 13

Парламенцкі дзённік

# АД КОЖНАЙ КАМІСІІ — ПА ЎЛАСНЫМ ЗАКОНАПРАЕКЦЕ

**Такое пажаданне выказаў спікер Палаты прадстаўнікоў**

**Пра гэта старшыня ніжняй палаты парламента Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА сказаў перад уручэннем нагрудных знакаў і пасведчанняў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, якое адбылося ўчора ў Авальнай зале Дома ўрада.**

«Думаю, што добрым унёскам у заканадаўчую скарбонку будзе падрыхтоўка кожнай камісіяй як мінімум аднаго законапраекта за чатыры гады. Калі атрымаецца больш, то гэта будзе толькі вітацца. Гэта павінны быць запатрабаваныя ініцыятывы, якія ідуць ад жыцця», — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка.

## Больш ініцыятывы і настойлівасці

Кіраўнік ніжняй палаты акрэсліў максімальны тэрмін знаходжання законапраектаў у парламенце — год. Ён заклікаў дэпутатаў не зводзіць сваю заканадаўчую дзейнасць да тэхнічных або дробных правак.

Яшчэ адно пажаданне — удзел у рабоце над законапраектамі да іх унясення ў Палату прадстаўнікоў. «Прыцягвайце да гэтай работы практыкаў, бізнес, грамадскія аб'яднанні, навукоўцаў, выкарыстоўвайце свой прафесіяналізм, міжнародны вопыт, вынікі работы ў акругах і аналіз зваротаў грамадзян, пытанні і прапановы выбаршчыкаў, якія былі агучаны ў ходзе перадвыбарнай кампаніі», — параіў старшыня.

Зараз у Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца 40 законапраектаў. Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу за паўгода падрыхтаваць праекты абноўленых Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. Уладзімір Андрэйчанка папрасіў узяць удзел у гэтай рабоце ўсіх парламентарыяў.

Самую сур'ёзную ўвагу спікер заклікаў звяртаць на аналіз правапрымяняльнай практыкі, вынікам якога павінны стаць запатрабаваныя папраўкі ў законы.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў нагадаў і аб праве дэпутатаў звяртацца ў Канстытуцыйны суд па праверку канстытуцыйнасці нарматыўных актаў. «Грамадзяне такога права не маюць. Людзі накіроўваюць пытанні ў парламент. За 2019 год унесена 37 прапаноў. Папрашу парламентарыяў старанна аналізаваць гэтыя звароты. Калі прапановы, якія ўносяць грамадзяне, заслугоўваюць увагі, то Палата прадстаўнікоў павінна звярнуцца ў Канстытуцыйны суд», — упэўнены кіраўнік ніжняй палаты.

## Быць у адкрытым доступе

У міжнароднай дзейнасці дэпутатам варта нацэльвацца не толькі на развіццё прафесійных і палітычных кантактаў, лічыць спікер. «У цэнтры ўвагі павінны быць таксама пытанні рэалізацыі экспартнага патэнцыялу нашай краіны, прыцягнення замежных інвестыцый, умацавання міжкультурных сувязяў, абароны і прасоўвання нацыянальных інтарэсаў».

Пры гэтым важна не забываць аб прадпрыемствах і арганізацыях у сваіх рэгіёнах. «Выбаршчыкі павінны бачыць рэальную аддачу ад работы абраных дэпутатаў», — акцэнтаваў увагу Уладзімір Андрэйчанка.

Адносна работы ў выбарчых акругах кіраўнік ніжняй палаты расставіў наступныя акцэнты: умець слухаць, чуць людзей, дапамагаць ім у вырашэнні іх праблем, пазбягаць фармалізму.

«Прынцыповае значэнне мае павышэнне адкрытасці парламенцкай дзейнасці, — дадаў ён. — Варта актыўна супрацоўнічаць са сродкамі масавай інфармацыі. Трэба выкарыстоўваць рэсурсы персанальных сайтаў дэпутатаў, сацыяльныя сеткі, пашыраць магчымасці для зваротнай сувязі».

## Не баяцца інфармацыйнай прасторы

На гэтай жа сустрэчы ў дэпутатаў адбылася і своеасаблівая вучоба — народных абраннікаў пазнаёмілі з інфармацыйна-пошукавай сістэмай «Эталон», іншымі дзяржаўнымі інфармацыйнымі рэсурсамі, а таксама з выклікамі і рызыкай, якія звязаныя з сучаснай інфармацыйнай прасторай.

**Дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Алег МАКАРАЎ** расказаў народным абраннікам пра цывілізацыйныя трэнды, законы і тэхналогіі ў галіне інфармацыі і дэзінфармацыі. «На сённяшні дзень пры якасным вырабе фальшывага кантэксту нават экспертным шляхам немагчыма даказаць, што гэта хлусня, і адрозніць яе ад праўды, — папярэдзіў ён. — Больш за тое, на гэтыя тэхнічныя магчымасці накладваецца ўразлівасць грамадскай свядомасці. Іншымі словамі, калі такая інфармацыя запускаецца ў сетку і распаўсюджваецца, супрацьстаяць ёй чалавеку або грамадству вельмі складана».

### ❍ У тэму

**Міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** падчас чарговага пасяджэння ўдзельнікаў праекта БелТА і Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў «Экспертнае асяроддзе» «Deepfakes (глыбокія фэйкі): новы выклік інфармацыйнай бяспецы» выказаўся за тое, каб унесці ў заканадаўства такія паняцці, як fake і deepfake.

Міністр лічыць, што гэтую тэму ў кантэксце забеспячэння інфармацыйнай бяспекі трэба абмяркоўваць з усімі зацікаўленымі ў парламенце. На думку Аляксандра Карлюкевіча, неабходна ацаніць маштабы з'явы, патэнцыйныя пагрозы і падумаць, як выкласці гэта ў заканадаўчай базе. Ён выказаўся за тое, каб «ужо сёння рыхтаваць праекты, дзе будуць прапісаны такія паняцці, як fake і deepfake».

«Людзям неабходна растлумачыць, да чаго гэта прывядзе. Трэба сказаць, што ў нас не прынята, што можа насіць супрацьпраўны характар. Такім чынам будзе выказана пазіцыя не толькі дзяржавы, але і здаровай часткі грамадства. Калі мы сёння не падрыхтуемся да гэтага, то заўтра можам спазніцца», — упэўнены Аляксандр Карлюкевіч.

Ён адзначыў, што ўплыў СМІ і сацыяльных сетак у сучасным свеце ўзрастае і ў сувязі з гэтым у Беларусі варта задумацца аб радыкальных хутксасцях у эвалюцыі айчынных медыя.

*Fake ў перакладзе з англійскай «фальшывы» — падробка ў самым шырокім сэнсе.*

*Deepfakes — тэхналогіі штучнага сінтэзу чалавечай выявы, заснаваныя на выкарыстанні нейрасетак і штучнага інтэлекту, якія дазваляюць ствараць высокарэалістычныя фота- і відэавыявы людзей альбо ажыццяўляць мадыфікацыю фота-, аўдыё- і відэаматэрыялаў.*

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Блізкая ўлада

# РАЗМОВА ПА СУТНАСЦІ

**Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ адказаў на пытанні журналістаў рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ**

**Знамянальна, што сустрэча адбылася ў дзень нараджэння Магілёўскай вобласці. Губернатар ад абласной вертыкалі і сябе асабіста павіншаваў прысутных і падзякаваў за канструктыўную работу. А потым даў падрабязную справаздачу на тэму сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці і планаў на бягучы год.**



Фота БелТА.

— Летась была забяспечана станоўчая дынаміка развіцця вобласці, забяспечаны рост у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, — падкрэсліў губернатар. — Выкананы чатыры з шасці ключавых паказчыкаў — экспарт тавараў і паслуг, паступленне прамых замежных інвестыцый на 96,8 мільёна рублёў пры заданні 80 мільёнаў, створаны новыя рабочыя месцы. Але ў нас яшчэ хапае рэзерваў для росту ва ўсіх сферах народнагаспадарчага комплексу. Неабходна істотна прыбавіць у сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, павялічыць экспарт тавараў і паслуг і тым самым забяспечыць рост сярэдняй заработнай платы не менш чым да 1000 рублёў.

Больш важкае становіцца ўздзеянне прадпрымальніцкага складніка. Сёння на тэрыторыі Магілёўскай вобласці зарэгістравана 8700 прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу і 24700 індывідуальных прадпрымальнікаў. Удзельная іх вага ў аб'ёме прамысловай вытворчасці займае 24 %, а ў экспарце — амаль 39 %. Дарэчы, толькі за мінулы год 3300 чалавек зарэгістравалася ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў і было створана 639 новых прадпрыемстваў.

З 2013 года на тэрыторыі сямі раёнаў Магілёўскай вобласці рэалізуецца праграма развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна. Адбыліся станоўчыя перамены, але не настолькі істотныя, як хацелася б. Губернатар паведаміў, што мэты і задачы застаюцца ранейшыя — стварэнне спрыяльных умоў для жыцця і работы мясцовага насельніцтва. Прэзідэнт падтрымаў прапановы аблвыканкама па далейшым развіцці гэтых тэрыторый. Сёлета Банкам развіцця ў іх будзе ўкладзена 130 мільёнаў рублёў крэдытных рэсурсаў. Ствараюцца рабочыя месцы ў Слаўгарадскім раёне, дзе пабудаваны свінакомплекс на 24 тысячы галоў. 97 рабочых месцаў прапануе вядомае бабруйскае прадпрыемства «Чырвоны харчавік», якое сёлета адкрывае ў Слаўгарадзе свой кандытарскі цэх. У Клімавічах наладжана вытворчасць па вырабе драўнянага вугалю, дзе будзе працаваць болей за 50 чалавек. Яшчэ каля 60 рабочых месцаў прапануюць жыхарам Крычаўскага раёна, дзе будзе запушчаны вертыкальна інтэграваны комплекс па вытворчасці свініны.

Магілёў таксама чакаюць прыемныя перамены. Леанід Заяц паведаміў, што вядзецца распрацоўка праектнай дакументацыі на будаўніцтва дублёра дарогі па мінскім напрамку, якая звяжа мікрараён Казіміраўка з праспектам Шміта праз вуліцу Касманаўтаў. У горадзе таксама працягваецца ўзвядзенне шэрагу спартыўных і медыцынскіх аб'ектаў, і ў першую чаргу з уліку незавершаных будоўляў.

Было закранутае пытанне па прадпрыемстве «Омск-Карбон-Магілёў», якое пачне працу сёлета і будзе спецыялізавацца на вытворчасці тэхвугляроду. Людзей турбуе яго ўздзеянне на экалогію. Губернатар паведаміў, што ўсё робіцца для таго, каб новая вытворчасць была бяспечная.

Карэспандэнт «Звязды» пацікавілася, як будзе рэалізоўвацца праграма па захаванні культурнай спадчыны.

— Рыхтуемся прыняць у Бялынічах мерапрыемства рэспубліканскага маштабу — Дзень пісьменнасці, — паведаміў губернатар. — Вызначаны шэраг аб'ектаў, якія трэба прывесці ў парадак, каб надаць гораду сучасны выгляд і годна правесці свята. Акрамя гэтага да дня 75-годдзя Перамогі ў вёсцы Боркі Кіраўскага раёна, якую 78 гадоў таму немцы спалілі разам з жыхарамі гэтай і найбліжэйшых вёсак, плануецца ствараць дадатковыя аб'екты па захаванні памяці ахвяр фашызму. Тут існуе мемарыял у гонар жыхароў 112 населеных пунктаў, якіх спасцігла доля Боркаў. Будзе зроблена рэканструкцыя прылеглай тэрыторыі, а на мемарыяльных плітах з'явяцца назвы яшчэ 33 спаленых вёсак. Зробім таксама стылізаваную вуліцу, якая калісьці існавала, іададзім некалькі новых кампазіцый, каб узмацніць эмацыянальны складнік пра тыя жахлівыя падзеі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Эканамікс

# Шахцёры пракладаюць новыя шляхі

**Еўразійскі банк развіцця падпісаў крэдытную дамову з ААТ «Беларуськалій»**

**Сродкі ў памеры 400 мільёнаў долараў пойдуць на тэхнічнае пераўзбраенне, папаўненне абаротных сродкаў прадпрыемства. Тэрмін крэдыту — пяць гадоў.**

«Вытворчасць кампаніі арыентавана на экспарт, таму спакойна падпісваем, без дзяржгарантый. Лічым, што гэта ўзаемны давер», — адзначыў **старшыня праўлення ЕАБР Андрэй БЕЛЬЯНІНАЎ.**

Перамовы наконт крэдыту ішлі даўно, і першая частка сродкаў у памеры 100 мільёнаў долараў ужо раней была пералічана «Беларуськалію».

Па словах Андрэя Бельянінава, банк бярэ ўдзел у рэалізацыі ў нашай краіне энергетычных праектаў, будаўніцтве аўтадарог. Цікавіць партнёраў супрацоўніцтва з магілёўскімі прадпрыемствамі па тэхнічным пераасняшчэнні ліфтавай гаспадаркі ў краінах Еўразіі. Пацвердзіў свае інтарэсы ЕАБР па ўдзеле ў прыватызацыі «Белінвестбанка».

«Хочацца пахваліцца: у нас была адна з задач, каб сума актываў банка перавысіла 5 мільярдаў долараў. Цяпер мы закрылі год з сумай 5,2 (мільярда долараў. — **«Зв.»**), — сказаў журналістам Андрэй Бельянінаў.

Частка сродкаў, выдаткаваных «Беларуськалію», пойдзе на заканчэнне ўзвядзення Петрыкаўскага горна-абагачальнага камбіната.

«Будаўніцтва першай чаргі завершана на 90 працэнтаў. Плануем у 2021 годзе закончыць яго. Ужо пачаліся работы на калійным гарызонце, вядзецца праходка горных выпрацовак, — расказаў **генеральны дырэктар ААТ «Беларуськалій» Іван ГАЛАВАТЫ.** — Гэта не адтэрміноўка, гэта планава — 2021 год згодна з інвестыцыйнай дамовай. Камбінат немагчыма запусціць і адразу выйсці на праектныя магутнасці: пасля запуску ў 2021 годзе ён будзе выходзіць на іх на працягу трох гадоў».

На рэалізацыю гэтага праекта ўжо патрачана 690 мільёнаў долараў. Сёлета ўкладуць яшчэ 200—250 мільёнаў за кошт крэдыту ЕАБР і ўласных сродкаў прадпрыемства.

Крэдытныя грошы будуць асвоены і пры будаўніцтве Дарасінскага рудніка, запуску другой чаргі завода па вытворчасці нітрату калію.

Цяпер «Беларуськалій» працуе з загрузкай магутнасцяў на 75—80 працэнтаў. Гэта дае магчымасці для мадэрнізацыі прадпрыемства.

Сёння прыкладна 10 працэнтаў прадукцыі ідзе на ўнутраны рынак, 90 — экспартуецца. З адкрыццём Петрыкаўскага ГАК «Беларуськалій» зможа ў год выраблянь да 15 мільёнаў тон угнаенняў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Сацыяльная адказнасць

# З беларусамі — па-беларуску

## З падтрымкай А1 мы працягнем чытаць на роднай мове, выбіраць здаровы лад жыцця і павышаць экалагічную адукаванасць

**Кампанія А1 сёлета працягне шэраг сацыяльных праектаў. Яны па-ранейшаму будуць дапамагаць дзецям і падтрымліваць нацыянальную ідэнтычнасць. Акрамя гэтага, з'явіцца новы кірунак — экалагічны. Традыцыйна больш за палову свайго прыбытку кампанія рэінвестуе ў нацыянальную эканоміку, у тым ліку на сацыяльныя праграмы, а гэта каля мільярда долараў. Дзякуючы такім праектам, у прыватнасці, мы адчулі, што такое «Венскі баль», атрымалі асалоду ад «Класікі ля Ратушы» і сотага юбілейнага сезона ў Купалаўскім тэатры. Сёлета з падтрымкай і заахвочваннем А1 беларусы далучацца да авангарднага мастацтва УНОВІС, працягнуць бегаць, чытаць па-беларуску і павысяць сваю экалагічную адукаванасць, паабяцаў генеральны дырэктар кампаніі А1 Гельмут ДУЗ.**



— Некалькі гадоў таму наша кампанія стала першай, хто звярнуўся да сваіх кліентаў па-беларуску. Гэта для нас прынцыпова важна і цяпер. На падтрымцы роднай мовы грунтаваліся нашы сацыяльныя праекты ў сферы адукацыі і культуры. Найперш гэта ранейшы праект «Чытаем па-беларуску з Velcom». Развіваючы забаўляльны кантэнт, мы пачалі перакладаць замежныя фільмы на родную мову (праект «Беларускія ўік-энды»), і на такія сеансы найхутчэй прадаваліся білеты, — адзначыў Гельмут Дуз.

Падтрымцы беларускай мовы былі прысвечаны адукацыйны праект для старшакласнікаў «Першыя» і ініцыятыва па папулярызацыі сучаснай беларускай літаратуры MOVABOX. Кампанія А1 і далей мае намер размаўляць з беларусамі на іх роднай мове. У найбліжэйшы час з'явіцца праект «Мова» (яго падрабязнасці пакуль не афішуюць) і іншыя.

Сёлета кампанія мае намер усур'ёз падтрымаць экалагічныя ініцыятывы. Для гэтага будзе праведзена маштабная навуковая канферэнцыя з удзелам экспертаў. Заслухаўшы іх прапановы, А1 вылучыць канкрэтныя ідэі ды ініцыятывы, якія і падтрымае. Галоўнае, да чаго мабільны аператар хоча прыцягнуць увагу, — павышэнне экалагічнай адукаванасці беларусаў.

— У Аўстрыі (мабільны аператар А1 з'яўляецца часткай міжнароднай групы А1 Telekom Austria Group. — **«Зв.»**) нельга нават уявіць, што ты выкінеш батарэйку проста ў смецце, там усе сартуюць адходы. Але ў многіх краінах свету існуе такая праблема: людзі не задумваюцца, што іх дзеянні могуць нешта змяніць у экалогіі, — адзначыў Гельмут Дуз.

«Беларуская культура — важная старонка ў культуры еўрапейскай», — лічаць у кампаніі і таму далучацца да арганізацыі святкавання 100-гадовага юбілею сусветна вядомага мастацкага аб'яднання УНОВІС, заснаванага Казімірам Малевічам у Віцебску. У межах праекта #UNOVIS100 адбудзецца шэраг мерапрыемстваў у Віцебскім цэнтры сучаснага мастацтва, а ў Мінску будзе арганізавана выстаўка, прысвечаная дзейнасці аб'яднання.

А вось папулярны праект «Бяжым у дапамогу дзецям» (або Velcombegom) завяршыў сваё існаванне разам з рэбрэндынгам кампаніі, які прайшоў летась. Але бегаць разам беларусам прапануюць ізноў.

— Velcombegom — знакавы для нас праект, мы прыцягнулі вялікую колькасць не толькі тых, хто ахвяраваў сродкі, але і тых, хто актыўна бегаў. Нават беларусы, якія знаходзіліся не дома, а дзесьці ў Кітаі і на Кубе, бегалі і дасылалі нам вынікі. Разам мы пераадолелі 100 тысяч кіламетраў, гэта выдатныя прыклады. Аўстрыйцы былі б занадта лянівыя для такога праекта. А ў Беларусі ён стаў магчымы, і нешта падобнае мы абавязкова прапануем у будучыні, — паабяцаў генеральны дырэктар.

Праект «Я бачу», у рамках якога 50 тысяч школьнікаў з аддаленых вёсак прайшлі дыягностыку зроку, таксама завершаны. Гельмут Дуз высока ацаніў кваліфікацыю нашых урачоў:

— Я нядаўна вярнуўся з Аўстрыі са зламанай нагой. Але дзякуючы беларускім медыкам зноў стаў дастаткова мабільны. Я часам звяртаюся па медыцынскую дапамогу і маю ўяўленне пра высокую кваліфікацыю беларускіх урачоў. Але ёсць рэчы, якія аб'ектыўна маюць патрэбу ў грашах. Таму мы падтрымалі праект «Я бачу». Ёсць ініцыятывы, вынік якіх адчувальны адразу, ёсць тыя, якія патрабуюць часу на распрацоўку, а гэта мільёны долараў. Больш за 50 % нашага прыбытку мы рэінвестуем у нацыянальную эканоміку Беларусі, — сказаў генеральны дырэктар, адказваючы на пытанне пра кошт сацыяльных праектаў кампаніі.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Прыёмы ў студзені

**Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае прыём грамадзян і юрыдычных асоб. Па інфармацыі БелТА, чарговыя сустрэчы пройдуць з 16 да 29 студзеня.**

**Намеснік старшыні Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга ЧУПРЫС** з 10 гадзін прыме грамадзян у Адміністрацыі Прэзідэнта сёння, **16 студзеня.** З 12.30 на прадпрыемстве ААТ «Давыд-Гарадоцкі электрамеханічны завод» (Столінскі раён) слухае звароты **памочнік Прэзідэнта—інспектар па Брэсцкай вобласці Анатоль МАРКЕВІЧ.**

**21 студзеня** ва Уздзенскім райвыканкаме чакае грамадзян **памочнік Прэзідэнта—інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ.**

У сераду, **22 студзеня,** жыхары сталіцы могуць звярнуцца да **памочніка Прэзідэнта—інспектара па Мінску Віталя ПРЫМЫ.** Прыём запланаваны ў Мінскім гарвыканкаме.

Праблемныя пытанні грамадзян **23 студзеня** выслухае **начальнік галоўнага эканамічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый БАРАБАНАЎ.** Пачатак мерапрыемства а 10-й гадзіне ў Адміністрацыі Прэзідэнта.

Прыём грамадзян у Аршанскім райвыканкаме **28 студзеня** правядзе **памочнік Прэзідэнта—інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль ЛІНЕВІЧ.**

У апошнюю сераду месяца, **29 студзеня,** са зваротамі грамадзян будуць працаваць у Баранавіцкім райвыканкаме **памочнік Прэзідэнта—інспектар па Брэсцкай вобласці Анатоль МАРКЕВІЧ,** у Гродзенскім гарвыканкаме — **памочнік Прэзідэнта—інспектар па Гродзенскай вобласці Іван ЛАЎРЫНОВІЧ.**

Запіс па прыём ажыццяўляецца ў аддзелах па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Армія Судана ўзяла пад кантроль сітуацыю ў Хартуме



Супрацоўнікі аператыўнага ўпраўлення службы агульнай разведкі Судана зладзілі бунт у знак пратэсту супраць рашэння ўлад рэфармаваць іх ведамства. Яны выйшлі на вуліцы сталіцы краіны, узвялі барыкады і пачалі страляць у паветра. Праз некалькі гадзін мяцеж утаймавала рэгулярная армія, паведаміла агенцтва Reuters.

Паветраная прастора над краінай была закрыта на працягу пяці гадзін. Міністр інфармацыі Судана Фейсал Махамед Салех заявіў па тэлебачанні, што кіраўніцтва спецслужбаў вырашыла рэфармаваць дзейнасць разведкі. Супрацоўнікам прапануецца альбо далучыцца да сіл хуткага рэагавання, альбо сысці з работы. Паводле звестак France-Presse, у выніку страляніны былі параненыя пяць чалавек, у тым ліку 15-гадовы падлетак і адзін з суданскіх вайскоўцаў. Сведкі расказалі гэтаму агенцтву, што стральба была чуваць каля двух баз аператыўнага ўпраўлення Службы агульнай разведкі. Да іх былі накіраваны грузавікі з байцамі сіл хуткага рэагавання. Там таксама бачылі танкі.

## Барыс Джонсан адмовіў Шатландыі ў паўторным рэферэндуме аб незалежнасці



Пра гэта прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі паведаміў у сваім лісце да першага міністра Шатландыі Ніколе Стэрджэн. «Чарговы рэферэндум аб незалежнасці будзе спрыяць працягу палітычнай стагнацыі, у якой знаходзіцца Шатландыя на працягу апошніх дзесяці гадоў, — адзначыў Джонсан. — Вы і ваш папярэднік асабіста давалі абяцанне, што рэферэндум аб незалежнасці 2014 года быў «адзіны ў гэтым пакаленні». Народ Шатландыі рашуча прагаласаваў за тое, каб разам захаваць Злучанае Каралеўства». Першы міністр Шатландыі Нікола Стэрджэн заявіла ў зваротным лісце Джонсану, што лічыць пазіцыю Лондана па правядзенні рэферэндуму разбуральнай. «Торы ў жаху ад таго, што ў Шатландыі ёсць права выбіраць сваю будучыню. Яны ведаюць, што, калі нам будзе дадзены шанц, мы абяром незалежнасць», — адзначаецца ў тэксце ліста, апублікаванага Стэрджэн у Twitter.

## Самалёт скінуў паліва на школы Лос-Анджэлеса



Як мінімум 60 дзяцей і дарослых звярнуліся па медыцынскую дапамогу пасля таго, як на іх трапіла авіяцыйнае паліва. Яго скінуў лайнер Boeing 777-200, што ішоў на экстранную пасадку ў аэрапорце Лос-Анджэлеса. Газа з паліўных бакаў разышлася над раёнам, дзе знаходзіцца шэсць школ, і трапіла, у прыватнасці, на дзіцячую пляцоўку. У момант здарэння два класы пачатковай школы ў Кудахі — прыгарадзе Лос-Анджэлеса за 26 кіламетраў ад аэрапорта — былі на прагулцы. Пацярпелыя скардзяцца на цяжкасці з дыханнем і раздражненні скуры. Рэйс Delta 89 вылецеў з Лос-Анджэлеса ў Шанхай, але пасля паломкі ў рухавіку экіпаж прыняў рашэнне тэрмінова вярнуцца. Авіякампанія Delta Airlines афіцыйна пацвердзіла, што скіданне паліва спатрэбілася для змяншэння вагі самалёта перад экстраннай пасадкай. Прызямленне лайнера прайшло ўдала, пацярпелых сярод пасажыраў і экіпажа няма. Авіяцыйнае ведамства ЗША заявіла, што скіданне паліва з бакаў перад экстраннай пасадкай па правілах можа ажыццяўляцца толькі над спецыяльна абазначанымі нежылымі раёнамі. Ідзе расследаванне.

ПАДЗЕІ ФАКТЫ НАВІНЫ

## ЖУРАЎЛІ ВЯРНУЛІСЯ. ЗІМЫ НЕ БУДЗЕ?

**На Брэстчыне заўважаны першыя чароды жураўлёў, якія вярнуліся з цёплых краёў.**

Шэрыя птахі з курлыканнем ляцелі над Брэстам 11 студзеня. А на наступны дзень над горадам пралякалі белалобыя гусі. У Палескім аграрна-экалагічным інстытуце НАН Беларусі адзначылі, што ў сярэдзіне студзеня ў наш рэгіён вярнуліся многія пералётныя птушкі. Пары сокала-пустальгі, напрыклад, прыляцелі ў гнёзды і пачалі такаваць. Птушкі перабільшылі поры года. І гэта не вельмі добра. Спецыялісты адзначаюць, што ў выпадку надыходу маразоў яны пададуцца на палі, напрыклад, за азімым рапсам, будуць знішчаць і іншыя культуры. Ну а калі зіма па-сапраўднаму пачне паказваць нораў, птушкі будуць вымушаны зноў адлятаць у цяплейшыя мясціны, што стане для іх дадатковым выпрабаваннем.

Бывалі выпадкі, калі жураўлі прыляталі на Брэстчыну ў сярэдзіне лютага, а вось каб у студзені... Можа, і праўда зімы не будзе, яны ж умеюць адчуваць гэта лепш за нас?

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ІНТЭРНЭТ ПАДАРАЖЭЕ НЯЗНАЧНА

**З 25 студзеня РУП «Белтэлекам» павышае тарыфы на шэраг паслуг.**

Тарыфы на доступ у інтэрнэт павялічацца для абанентаў у сярэднім на 2,5 %.

«Рашэнне аб пераглядзе тарыфаў прынятае ў рамках запланаванага на 2020 год індэкса росту спажывецкіх цэн для падтрымання акупнасці паслуг электрасувязі на ўзроўні 2019 года, — тлумачаць у кампаніі. — Ад узроўню тарыфаў і ўзроўню акупнасці паслуг электрасувязі наўпрост залежаць магчымасць развіцця інфраструктуры, правядзенне неадкладных мерапрыемстваў па падтрыманні якасці паслуг электрасувязі, забеспячэнне бяспекі інфармацыі...»

Змяненне кошту не закране рэгуляваныя тарыфы на паслугі мясцовай і міжгародняй тэлефоннай сувязі, паслугі давання доступу да міжнародных сетак перадачы даных, у тым ліку доступу да інтэрнэту для аператараў электрасувязі, паслугі хостынгу, відэакантролю і іншыя.

З абноўленымі тарыфамі можна азнаёміцца на сайце https/beltelecom.bv.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## НА ХУТКАСЦІ 130 км/г...

**Дзяўчына са стажам кіроўцы менш за год перакулілася на трасе Мінск—Гродна. Пацярпелі два пасажыры, паведамляе УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Каля трох гадзін ночы на аўтадарозе Мінск—Гродна адбылося ДТЗ. 19-гадовая дзяўчына, кіруючы аўтамабілем «Рэно», ехала са Скідзеля ў абласны цэнтр. Паблізу вёскі Абухава з-за няправільна выбранай хуткасці яна не справілася з кіраваннем і з'ехала ў кювет, дзе некалькі разоў перакулілася.

Хуткасць аўтамабіля складала каля 130 кіламетраў у гадзіну. Пасведчанне кіроўцы дзяўчына атрымала летась. У выніку ДТЗ траўмы атрымалі два пасажыры, якія пасля агляду медыкаў ва ўстанове аховы здароўя былі адпушчаныя дадому. Сама кіроўца не пацярпела.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ВЫРАТАВАЦЬ ЗАМАК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Паведамленне пра тое, што гарыць замак, тады паступіла на пульт дзяжурнага ў 19.20 вечара, — згадвае суразмоўца. — Сюды мы прыехалі на дзвюх аўтацыстэрнах. Агонь вельмі шпарка распаўсюджваўся па драўляных будаўнічых канструкцыях. Палала гарышча, полымя пачынала распаўсюджвацца на паўднёвую і ўсходнюю галерэі. Лёгкаўзгаральныя аздабленчыя матэрыялы і шматлікія пусткі спрыялі гэтаму. Тэхніка ў нас на той час была не з такім вялікім запасам вады, як цяпер.

Але мала было проста затушыць полымя. Стаяла задача зрабіць гэта як мага больш ашчадна, бо і сам замак, і ўсё, што было ўнутры яго, уяўляла матэрыяльную каштоўнасць — карціны, фрэскі. А ўмовы для гэтага былі надзвычай неспрыяльныя — у тую ноч слупок тэрмометра падаў да адзнакі ў мінус дваццаць. Было ветрана. Тушылі мы тады да раніцы...



Нягледзячы на ўсё, 92 ратавальнікі пры дапамозе 19 адзінак тэхнікі выйшлі ў тым змаганні пераможцамі. Як і ў Парыжы, Нясвіжскі замак загарэўся ад чалавечай неахайнасці. Гарантаваць, што гэта ніколі не адбудзецца зноў, немагчыма. Да пажару заўжды трэба быць напагатове. Менавіта таму на тэрыторыі Нясвіжскага замка разгарнуліся буйнамаштабныя вучэнні, якія праводзіліся падраздзяленнямі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Іх сцэнарый прадугледжваў максімальна магчымы адначасовы збег многіх небяспечных з'яў.

Паводле легенды, на вадаёме побач з замкам перакулілася судна. Пакуль плыўцы і вадалазы ратуюць тых, хто знаходзіцца ў вадзе, — непадалёк на праездзе трапляюць у дарожна-транспартнае здарэнне два аўтамабілі. Абодва яны вязуць небяспечныя рэчывы — аміяк і крыніцу іанізуючага выпраменьвання. Каля машын разгарнулася цэлая выратавальная аперацыя.

Спачатку на мясцовасці была праведзена радыяцыйная разведка. Пасля з салонаў выцягнулі кіроўцаў, якія з'яўляліся ўмоўнымі пацярпелымі. Разлікі ратавальнікаў праклалі адмысловыя рукавы, дзякуючы якім была створана водная завеса — яна неабходная для таго, каб асадзіць небяспечныя хімічныя выпарэнні на зямлю. А крыніцу радыяцыі вельмі асцярожна перамясцілі ў спецыяльны свінцовы «домік».



Фінальны этап вучэнняў распачаўся непасрэдна на тэрыторыі замка. Ён распрацоўваўся паводле падзей снежня 2002 года. Меркавалася, што ўнутры помніка архітэктуры адбыўся магутны пажар на плошчы 150 квадратных метраў. Больш за тое, каля трыццаці наведвальнікаў аказаліся адрэзаныя агнём ад шляхоў эвакуацыі. Тут заставаўся толькі адзіны варыянт, як пакінуць задымленае памяшканне, — праз акно. Туды ратавальнікі падняліся пры дапамозе аўтаматызаванага пад'ёмніка.

— На тэрыторыі нашага рэгіёна налічваецца каля 800 аб'ектаў з кругласутачным знаходжаннем людзей, — паведаміў **начальнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей ЛАПАНОВІЧ.** — Яны ўсе знаходзяцца на асаблівым кантролі. У тым жа Нясвіжскім замку мы пастаянна праводзім практычныя заняткі. Гэта трэба для таго, каб у выпадку баявога выезду нашы спецыялісты валодалі ўсёй патрэбнай інфармацыяй і маглі прыняць правільнае рашэнне. Тым больш што тушэнне ўскладнена гісторыка-культурным статусам аб'екта. А на выезды прыцягваюцца ратавальнікі з усіх суседніх гарнізонаў.



Рэалістычнасці вучэнням дадаваў магутны туман, які яшчэ з ночы агарнуў Нясвіж і яго ваколіцы і яшчэ больш пагаршаў бачнасць.

Але ўнутраны дворык замка не такі вялікі, каб размясціць у ім вялікую колькасць аўтавышак. Тут варта прыгадаць падзеі 11 верасня 2001 года ў Нью-Ёрку, калі гарэлі вежы Сусветнага гандлёвага цэнтра, шмат людзей разбілася, выскокваючы праз вокны. Ратавальнікі адрэпеціравалі і такі варыянт магчымага развіцця падзей. Ва ўнутраным дворыку Нясвіжскага замка быў устаноўлены адмысловы «куб жыцця».

У нашым выпадку гэта Клецкі, Стаўбцоўскі і Слуцкі аддзелы па надзвычайных сітуацыях, дзе таксама ёсць вышынная тэхніка.

Толькі за апошнія два гады больш за сто архітэктурных помнікаў па ўсёй Мінскай вобласці былі абсталяваны сродкамі аўтаматычнай пажарнай сігналізацыі і апавяшчэння. Усе такія аб'екты цяпер знаходзяцца пад абаронай сістэмы «Маланка». І хочацца спадзявацца, што такія падзеі заўжды будуць разгортвацца толькі падчас планавых вучэнняў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота МНС.**

Тым часам

## Беларускія ратавальнікі адправяцца ў Турцыю

**Пра гэта падчас прэс-канферэнцыі паведаміў міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА.**

— Летась мы ўдзельнічалі ў гуманітарных аперацыях. Былі сфарміраваны і даастаўлены гуманітарныя грузы ў Сірыю, Мазамбік і Зімбабве. Акрамя таго, дапамагалі і ў тушэнні лясных пажараў. Так, на працягу 2019 года два беларускія барты працавалі ў Турцыі. Адзін з іх пачаў выконваць задачы 1 чэрвеня, другі — 1 ліпеня. Сёлета будзе падпісана адмысловае пагадненне. На тушэнні пажараў у Турцыі мы будзем працаваць з 1 мая і да позняй восені. Звярталіся да нас і прадстаўнікі Грэцыі, але яны не змаглі выйграць тэндар.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца падрыхтоўцы ратавальнікаў.

— Летась мы актыўна працавалі ў галіне бяспекі падчас II Еўрапейскіх гульняў. Была праведзена вялікая работа, што дало станоўчыя вынікі. Мы таксама ўдзельнічалі ў вучэннях, у тым ліку міжнародных, дзе атрымлівалі высокія ацэнкі.

Акрамя таго, стала вядома, што налета ў Мінску адкрыецца Рэспубліканскі цэнтр бяспекі. Цяпер у краіне працуюць сем рэгіянальных структур — дзве на Віцебшчыне і па адной у кожнай вобласці.

У цэнтры ўвагі

## Ёсць праблемы з будаўніцтвам жылля

### У КДК Гродзенскай вобласці звярнулі ўвагу на нізкія тэмпы ўводу ў эксплуатацыю жылых дамоў і парушэнні нарматыўных тэрмінаў

**Напрыклад, толькі чатыры раёны выканалі гадавы план па будаўніцтве жылля. Самы нізкі паказчык па ўводзе ў эксплуатацыю квадратных метраў жылой плошчы — у Свіслацкім раёне. Тут летась пабудаваны толькі індывідуальныя дамы агульнай плошчай 540 квадратных метраў.**

А вось планы па будаўніцтве 56-кватэрнага дома так і не здзейсніліся, хоць яго разлічвалі ўзвесці яшчэ ў 2018 годзе. Як высветлілася, не была своечасова распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя, што ў сваю чаргу не дазволіла ўнесці дом у спіс аб'ектаў для льготнага крэдытавання. У выніку жылы дом у Свіслачы давялося замяніць на 72-кватэрны ў Мастах.

Дарэчы, будаўніцтва шматкватэрных жылых дамоў у Свіслачы не вялося з 2016 года, хоць у спісе жыхароў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, знаходзіцца амаль 600 чалавек, у тым ліку больш за 70 шматдзетных сем'яў. Між тым кіраўнік дзяржавы ставіць задачу перад мясцовымі выканаўчымі ўладамі павялічыць аб'ёмы будаўніцтва жылля для гэтай катэгорыі, канстатуюць у дзяржкантролі.

Таксама ў КДК паведамілі пра парушэнне нарматыўных тэрмінаў будаўніцтва шматпавярховых жылых дамоў. Асабліва гэта датычыцца Гродна, дзе ўзводзяцца новыя мікрараёны, а таксама Смаргоні і Астраўца. Акрамя гэтага, па ўзгадненні з органамі ўлады забудоўшчыкамі практыкуецца спыненне работ, якое матывуецца недахопам абаротных сродкаў і зніжэннем попыту на рынку нерухомасці. Так, летась ААТ «Гроднажылбуд» прыпынена будаўніцтва пяці аб'ектаў, з іх тры перанесены на гэты год. Таксама ёсць няма фактаў нясвоечасовага выканання прадпрыемствам сезонных работ. Гэта датычыцца 17 жылых дамоў, дзе асобныя іх віды не выконваліся, хоць і былі перанесены на спрыяльны перыяд года.

Пра наяўнасць праблем і недахопаў у жыллёвым будаўніцтве сведчаць і шматлікія звароты грамадзян, якія паступаюць у дзяржкантроль. Больш за ўсё нараканняў на падрадную арганізацыю «Гроднааблсельбуд» і яе філіялы. Жыхары скардзяцца на няякаснае выкананне будаўнічых работ, парушэнне нарматываў, нясвоечасовасць, невыпраўленне дэфектаў у гарантыйны тэрмін. Большасць скаргаў датычыцца Гродна, Ліды і Шчучына. Некаторыя звароты ўдалося вырашыць станоўча з дапамогай дзяржаўных інспектараў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Ну і ну!

## Палез за цялём і сам ўграз

**Удзень ратавальнікам паступіла паведамленне пра заграззае ў забалочанай нізіне цяля каля вёскі Ганчары Іўеўскага раёна.**

Калі да месца выкліку прыбылі падраздзяленні МНС, высветлілася, што ратаваць трэба не толькі цяля — там жа захрас у гразі па грудзі і не мог рухацца мужчына.

Як паведамілі ў МНС, хутчэй за ўсё, пацярпелы, выклікаўшы ратавальнікаў, вырашыў паспрабаваць самастойна выцягнуць жывёлу і ў выніку сам трапіў у балота.

Ратавальнікі пры дапамозе вяроўкі паднялі мужчыну і цяля наверх. Пасля агляду брыгадай медыкаў шпіталізацыя пацярпелага не спатрэбілася.

## За два дні — больш за 260 боепрыпасаў

**Каля аграгарадка Парахонска Пінскага раёна пры расчыстцы зараснікаў каля чыгуначнага насыпу работнік заўважыў у зямлі прадмет, падобны на снарад.**

Прыбылыя сапёры вайсковай часці 7404 Унутраных войск дасталі з зямлі нямецкую мінамётную міну часоў Вялікай Айчыннай вайны. Выбухатэхнікі з дапамогай металашукальнікаў абследавалі прылеглую тэрыторыю па абодва бакі чыгуначнага палатна. І, як аказалася, недарэмна.На паверхню вайскоўцы дасталі 49 артылерыйскіх снарадаў калібрам 45 і 75 міліметраў, 35 мінамётных мін калібрам ад 50 да 120 міліметраў, 12 ручных гранат, а таксама ўзрывальнікі і запалы. На наступны дзень сапёрна-піратэхнічная група падняла на паверхню яшчэ больш за 165 розных боепрыпасаў.Знойдзены арсенал знішчылі на падрыўной пляцоўцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

16 СТУДЗЕНЯ 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 1 (15878)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Alen Hit:

# «Я яшчэ выступлю з сусветнай зоркай!»



**Ён — прыклад артыста, які без сувязяў, хаджэнняў «па галовах» і музычнай адукацыі змог дабрацца да вяршынь шоу-бізнесу, пры гэтым застаючыся добрым сябрам і пазітыўным чалавекам. Пра сакрэты поспеху, пра тое, як гэта — быць удзельнікам папулярных ТБ-конкурсаў кшталту «Х-фактар», «Голас», і многае іншае расказаў Алег ШЧУЦКІ, які выступае пад псеўданімам ALEN HIT.**

***— Чаму вырашылі займацца творчасцю не пад сваім імем?***

— Пад псеўданімам выступаю ўжо амаль дзесяць гадоў. Зразумеў, што трэба нешта мяняць, у самым пачатку свайго шляху. Маё прозвішча цяжка вымаўляць на англійскай мове. Нават на рускай яго часта блытаюць. У мяне палова дыпломаў падпісана як «Шуцкий», а не «Щуцкий». А для слухача важна, каб імя артыста было простае і запамінальнае. Таму вырашыў узяць псеўданім і стаў не Алег, а ALEN HIT. ALEN сугучна з маім імем, а HIT азначае поспех, і хацелася, каб кожная мая песня была хітом.

***— У які момант жыцця музыка перарасла з захаплення ў работу?***

— Здаецца, з самага дзяцінства жадаў, каб яна стала маёй прафесіяй. У школе быў салістам хору. Дарэчы, першае выступленне адбылося менавіта там, яго запомніў назаўсёды! *(Смяецца.)* Гэта была «лінейка» на першага верасня, і мы спявалі песню «Чорны кот». А далей кожнае лета ладзіў канцэрты ў бабулі ў двары — яна заўсёды верыла, што я буду артыстам.

***— А бацькі цябе падтрымлівалі?***

— Спачатку былі супраць. Існуе такі стэрэатып, што без грошай і сувязяў гэта немагчыма. І яны сумняваліся, што мае імкненні сур'ёзныя і да чагосьці прывядуць. Я паступіў у каледж на спецыяльнасць, звязаную з праграмаваннем, але музыкай займацца не пераставаў. Пачынаў як самавучка, а потым сам наймаў для сябе выкладчыка па вакале. Родныя прынялі гэты выбар гадоў пяць таму, калі мая творчасць перайшла на самаакупнасць. Але ведаю, што яны заўсёды ганарыліся мной, і для іх было галоўнае, каб я быў шчаслівы.

***— Ты згадаў сваё першае непрафесійнае выступленне... А што наконт выхаду на вялікую сцэну?***

— Маё жыццё як сапраўднага артыста пачалося, па-мойму, у 2011 годзе. Тады ўсё так навалілася, што вылучыць канкрэтна, з чаго пачаўся «зорны шлях», цяжкавата. Амаль дзесяць гадоў таму было! Для сябе вылучаю тры этапы. Першы — гэта выступленне ў Палацы спорту на першага верасня, толькі гэтым разам не для школьнай аўдыторыі, а для студэнтаў БДУ. Затым мяне паклікалі на конкурс «Новая хваля — 2011». Я быў вельмі здзіўлены і ў нейкай ступені эмацыянальна не гатовы, бо гэта спаборніцтва — сапраўднае нашэсце зорак эстрады. Ну а затым я выйграў свой першы кліп у конкурсе «ёМАё».

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Крытычны погляд

# ШКОЛА... ГОД 2134-ы...

## Разважанні 16-гадовай пісьменніцы Сафіі Ворсы пра бяздушнасць узорнай сістэмы



Аўтограф-сесія.

**«Канец жніўня 2134 года. Школа ўзорнай адукацыі вышэйшай ступені. Стары і ўтульны кабінет дырэктара — шафы з цёмнага дрэва, паркет, мэбля ў стылі французскай класікі. На стале ноўтбук. Уваходзяць дырэктар Дзмітрый Рыгоравіч і настаўніца Аліса Аляксандраўна. Педагог — светлавалосая жанчына з моднай стрыжкай — апранута стыльна і ярка: пінжак колеру марской хвалі і шырокія белыя брыджы, прыгожая белая блузка. На нагах — скураныя сліперы. У руках планшэт».**

**Менавіта так распачынаецца п'еса ў дзвюх дзеях юнай пісьменніцы Сафіі ВОРСЫ. Менш за год таму да 15-гадовай дзяўчыны звярнуліся з просьбай напісаць твор спецыяльна для сацыяльнага праекта — дзіцячага тэатра-студыі «Тэатр без межаў», дзе аснову акцёрскай трупы складаюць дзеці з прыёмных і шматдзетных сем'яў. Яго стварыла актрыса і журналіст Кацярына САКОВІЧ. На конкурсе «Місіс Беларусь — 2018», дзе дзяўчына перамагла, яна прадстаўляла менавіта гэты сацыяльны праект, і яе пачулі такія ж апантаныя людзі. Ідэю падтрымалі Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі (МГІРА) і гарадскі клуб замяшчальных бацькоў «Вулей». Сёння нюансы акцёрскай прафесіі ў ім асвойваюць 18 хлопцаў і дзяўчат ва ўзросце ад 9 да 17 гадоў.**

### ПРАЖЫЦЬ СВАЮ ГІСТОРЫЮ

— Мы вырашылі стварыць спецыяльнае асяроддзе, якое дазволіць дзецям з няпростым лёсам знайсці сябе, раскрыцца праз творчасць, ажыццявіць свае мары і наноў навучыцца глядзець на свет шырока расплюшчанымі добрымі вачыма, — кажа **начальнік упраўлення каардынацыі павышэння кваліфікацыі спецыялістаў выхаваўчай, сацыяльнай і псіхалагічнай службаў Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі Ніна ЗАХОЖАЯ.**

Тэатр — гэта агульная сям'я, і бацькі дзяцей таксама сталі яе актыўнымі закуліснымі членамі. Усе, хто прычыніўся да праекта, спадзяюцца, што калі яны разам са сваімі дзецьмі «пражывуць» хоць адну п'есу, гэта дапаможа ім знайсці агульную мову: не сакрэт, што дзеці з прыёмных сем'яў часта падманваюць сябе, і якая б ні была добрая прыёмная мама, родная матуля ў іх уяўленні ўсё роўна лепшая. Яны будуць шкадаваць пра тое, што ў іх не збылося, і жыць з болем і крыўдай у сэрцы. А калі дзеці навучацца пражываць чужую гісторыю, то змогуць пражыць і сваю.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Насустрач будучыні

# У РАБОТАДАЎЦЫ ДЛЯ ВАС — 45 СЕКУНД,

## або Як правільна скласці рэзюмэ

**Свае прапановы юнакам і дзяўчатам на чарговым «Кар'ерным форуме БДУ» падрыхтавалі больш за 20 айчынных і міжнародных кампаній, Дзяржаўны пагранічны і Следчы камітэты, банкі. На традыцыйным «Кірмашы вакансій» былі прадстаўлены IT-фірмы, транспартна-лагістычныя, аўдытарскія, кансалтынгавыя і іншыя кампаніі. Арганізатарам мерапрыемства выступіў навучальны аддзел Цэнтра кар'еры галоўнага ўпраўлення адукацыйнай дзейнасці Белдзяржуніверсітэта.**



Спецыяліст вядомай айчыннай кампаніі па вырабе мікрасхем «Інтэграл» зазначыў, што ім у калектыў патрэбныя як перакладчыкі, так і айцішнікі — месца знойдзецца ўсім. Адзін з экспертаў па распрацоўцы праграмнага забеспячэння Scand на пачатку сустрэчы нагадаў студэнтам, што калі яны хочуць прайсці практыку або стажыроўку ў гэтай сферы, патрабуецца добры ўзровень англійскай мовы. А вось у міжнароднай IT-кампаніі Qulix Systems, якая заклікае юнакоў і дзяўчат паспрабаваць свае сілы ў якасці тэсціроўшчыкаў і распрацоўшчыкаў, упэўненыя: нават калі ў кандыдата ёсць прабелы ў валоданні замежнай моваю, гэта можна лёгка выправіць — у многіх офісах ёсць бясплатныя курсы для кожнага ахвотнага.

Эксперт па рабоце з персаналам адной з найбуйнейшых аўдытарскіх кампаній EY расказала, што для таго, каб студэнт дакладна вызначыўся з кірункам развіцця ў фірме, яны перыядычна прапануюць розныя стажыроўкі і курсы: пачынаючы з тыднёвых, заканчваючы тымі, што доўжацца некалькі месяцаў. Акрамя таго, спікер таксама, як і іншыя, адзначыла: уся работа з кліентамі вядзецца на англійскай мове, таму такі навык за плячыма абавязковы.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
16 01 2020 г.

# ШКОЛА... ГОД 2134-ы...




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Я даўно выступаю на сцэне і выдатна разумею, наколькі важна для чалавека быць разняволеным, не баяцца публікі, пазбавіцца ад комплексаў і ўвайсці ў дарослае жыццё без страхаў і крыўды, — падхоплівае Кацярына. — У тэатры падлеткі вучацца паводзіць сябе перад гледачамі, працуюць над псіхафізікай, пластыкай цела, развіваюць увагу, назіральнасць, уменне фантазіраваць і імправізаваць. Мы вельмі шмат увагі ўдзяляем чытанню п'ес. Прызнаюся, гэта мой самы любімы жанр. І калі разам разбіраем твор, дзеці запаўняюць сваю нішу каштоўнасцяў. Таксама разам наведваем тэатральнае закулісце (у нас ёсць сябры ў Тэатры лялек, Рускім драматычным тэатры), ад чаго нашы выхаванцы проста ў захапленні. Дарэчы, у асваенні тэатральнага майстэрства ім дапамагаюць акцёры і рэжысёры прафесійных тэатраў. Для мяне няважна, ці выберуць яны ў далейшым акцёрскі шлях (калі гэта здарыцца, я буду, канешне, вельмі рада), галоўнае — дапамагчы ім раскрыцца.


Кіраўнік сацыяльнага праекта Кацярына Саковіч і аўтар п'есы «Дзень настаўніка» Сафія Ворса падчас прэзентацыі твора ў Грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы.

Між іншым, хоць тэатр дзейнічае ўсяго другі год, да юных акцёраў ужо прыйшоў першы поспех. На міжнародным фестывалі мастацтваў @mfest minsk у лістападзе мінулага года яго выхаванцы Кацярына Ветрава і Раман Пашкевіч заваявалі дыплом лаўрэатаў першай ступені з тэатральнай мініяцюрай «Пагуляем у дарослых».

## НЕЧАКАНАЯ ПРАПАНОВА

Натуральна, што асабліваму тэатру патрабуецца адметны драматург, які пісаў бы пра тое, што хвалюе менавіта падрастаючае пакаленне. Сафія Ворса — хоць і малады аўтар кніг для падлеткаў, але ўжо шырока вядомы. У 2018 годзе яна стала пераможцай літаратурнага конкурсу «Новыя імёны» ў Балгарыі, абышоўшы 500 канкурсантаў, і лаўрэатам міжнароднага літаратурнага конкурсу «Славянскія імёны» ў той жа краіне. З'яўляецца членам Міжнароднага саюза пісьменнікаў імя святых Мяфодзія і Кірыла (Балгарыя).

Напісаўшы аповесць «Горад сляпых скрыжаванняў», дзяўчына стала лаўрэатам конкурсу «Чалавек безбар'ернага асяроддзя — 2019» Міністэрства культуры і ўладальніцай прэміі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў. У кнізе яна расказала пра інклюзію ў грамадстве сумленна і адкрыта.

Таксама Сафія — намінант Нацыянальнай беларускай літаратурнай прэміі 2019 года. Зусім нядаўна юная пісьменніца атрымала званне лаўрэата спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, а Расійскі саюз пісьменнікаў прадставіў яе да ўзнагароджання медалём Антона Паўлавіча Чэхава. Урачыстая цырымонія пройдзе ў Маскве 26 студзеня. Эсэ аўтара друкуюцца ў Расіі, Японіі, Літве, Польшчы, Грэцыі... Але прапанова напісаць твор для «Тэатра без межаў» дзяўчыну крыху азадачыла.

— Ідэя ў мяне ўжо была, але, шчыра кажучы, я ніколі не думала, што напішу п'есу. Гэта не вельмі знаёмы мне жанр, таму большая частка работы заключалася ў тым, каб чытаць іншыя п'есы, вывучаць законы іх пабудовы, тое, як выстройваюцца дыялогі, як усё гэта афармляецца. Пачала пісаць п'есу ў сакавіку, а бліжэй да канца лета ўсё перапісвала, таму што ў працэсе стварэння твора ты развіваешся разам са сваім тэкстам, у тым ліку змяняюцца і твае погляды на герояў. Кацярына і яе выхаванцы натхнілі мяне на гэту работу. Спачатку прынесла ім першую частку, мы раіліся, і толькі потым пісала другую. Я лічу, што кожны чалавек — асоба, у тым ліку і маленькі, аднак дарослыя часта забываюць пра гэта. Яны навязваюць малым свае погляды, уяўленні, якая павінна быць іх будучыня, але насамрэч толькі псуюць ім жыццё.

## ВАР'ЯЦКІЯ ІДЭІ?

П'еса Сафіі Ворсы закранае сур'ёзныя тэмы. Чырвонай ніткай у тэксце праходзіць праблема фарміравання чалавечнасці і шчырасці, унікальнасці чалавечай асобы. Галоўныя героі — настаўніца Аліса Аляксандраўна і дырэктар Дзмітрый Рыгоравіч — адпраўлены аўтарам у далёкую будучыню — у 2134 год, дзе дзейнічае Міністэрства ўзорнай адукацыі...

«А што з гэтым пакаленнем? Што з гэтымі дзецьмі? Ім усяго пятнаццаць гадоў, а ў іх дарослыя вочы. Яны стаміліся ад жыцця. Але выбачайце, яны ж яшчэ і не жылі, яны нічога не ведаюць пра сапраўднае жыццё. Гэта ненармальна, і, думаю, менавіта таму вы паставілі мяне на гэты клас, — кажа дырэктару школы настаўніца Аліса Аляксандраўна, якой дастаўся 9 «А». — Вы ведалі, што я не стану мірыцца з класам, дзе растуць ужо дарослыя людзі. Вы ведалі, што дзіцячыя аповеды пра лета, якія больш падобныя да справаздач пра рабочую камандзіроўку, прывядуць мяне у жах».

Дарэчы, вучні 9 «А», замест таго каб летам адпачываць, вывучаюць праграму наступнага класа, ходзяць на курсы лічбавай лінгвістыкі, а паездку да роднай бабулі лічаць марнаваннем часу.

Асаблівая роля ў п'есе адводзіцца лістам, якія выпускнікі школы пісалі сваім настаўнікам, сябрам, бацькам або будучым дзевяцікласнікам: праз іх узнімаюцца важныя сацыяльныя праблемы бездушнасці, чэрствасці, стаўлення да людзей з абмежаванымі магчымасцямі, подласці, здрады, вернага сяброўства, цікавасці да абранай прафесіі.

Паступова лёд паміж дзецьмі і настаўніцай растае і жудасная дарослая адчужанасць знікае. Але высвятляецца, што пазбаўляць ад бяздушнасці трэба і іх бацькоў, і ўсю гэтую ўзорную школьную сістэму.

«Мы заносім у галовы дзяцей вар'яцкія ідэі пра любоў, дабрыню і чалавечае шчасце, а павінны падштурхнуць да выбару патрэбнай прафесіі і мар пра кар'ерную лесвіцу», — канстатуе дырэктар школы Дзмітрый Рыгоравіч.

«Няўжо яны не разумеюць, што кар'ера — не галоўнае, прафесія яны навучацца. Галоўнае — навучыць чалавека паважаць меркаванні і пачуцці іншых людзей, закласці прынцыпы, якія дапамогуць заўсёды заставацца чалавекам», — кажа настаўніца, якая марыць пра рэформу мовы, якая дазволіла б зрабіць слова «чалавек» галоўным назоўнікам.

«Міністэрства ўзорнай адукацыі лічыць, што тое, чаму мы вучым нашых дзяцей, шкодна і недапушчальна», — адказвае ёй дырэктар.

Нейкі функцыянер, які баіцца страціць ілюзію ўласнай значнасці, патрабуе ад яго звольніць настаўніцу, а падчас праверкі, прызначанай Міністэрствам узорнай адукацыі, паказаць ім дзяцей, якія імкнуцца стаць лічбавымі лінгвістамі і IT-спецыялістамі.

За свае погляды настаўніца апынецца ў турме, а дырэктар звольніцца, бо не хоча вучыць дзяцей таму, у што сам не верыць, і не жадае далей жыць у страху перад праверкамі. І ўсё ж такі п'еса не магла скончыцца на такой сумнай ноце. У фінале галоўная гераіня выходзіць з турмы, дзе яе сустракаюць з любімымі кветкамі былыя дзевяцікласнікі, цяпер ужо былы дырэктар школы і віншуюць з Днём настаўніка.

У новай кнігі Сафіі Ворсы ёсць адна адметнасць: яна друкавалася як трансформер, і калі яе перавярнуць, то можна прачытаць тэкст на беларускай ці рускай мове. Да таго ж выданне аздоблена шматлікімі ілюстрацыямі Маргарыты Ціхановіч. «Яна рабіла малюнкі да ўсіх маіх кніг. Мы з ёй выдатна адчуваем адна адну, і я цалкам ёй давяраю», — кажа пісьменніца.


Сустрэча юных акцёраў «Тэатр без межаў» з аўтарам.

Рэпетыцыі спектакля па п'есе Сафіі Ворсы ўжо распачаліся. Вясной «Тэатр без межаў» плануе паказаць яго на міжнародным тэатральным фестывалі ў Ізраілі.

На пытанне, ці не будзе Сафія супраць, калі яе п'есу захочуць паставіць у якім-небудзь іншым тэатры, дзяўчына сціпла адказала: «Гэта будзе для мяне гонарам».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота аўтара і «Тэатра без межаў».**

*Не прапусці!*

# Крэатон ад «Першых» для падлеткаў

**18 студзеня ў Віцебску стартуе крэатон для старшакласнікаў, удзел у якім могуць узяць вучні з усёй Беларусі. Ён адбудзецца ў рамках сацыяльна-адукацыйнага праекта «Першыя», які рэалізуецца кампаніяй А1 пры падтрымцы арганізатараў канферэнцыі TEDxMinsk. У лютым крэатоны таксама пройдуць у Магілёве, Гродне і Гомелі.**




Першае мерапрыемства будзе прысвечана культуры. Месца правядзення — Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва. Да ўдзелу ў ім запрашаюцца вучні 9—11 класаў з усёй краіны, якім цікава патрэніравацца генераваць ідэі, прадставіць іх на публіцы і атрымаць парады і каментарыі ад экспертаў. Удзел у крэатоне бясплатны, але па папярэдняй рэгістрацыі на сайце www.generation.a1.by

Старшакласнікам пакажуць некалькі ролікаў TED для далейшага абмеркавання ў невялікіх групах пад кіраўніцтвам ментараў, кожны з якіх дапаможа камандам распрацаваць уласныя ідэі па тэмах відэавыступленняў і прэзентаваць іх перад аўдыторыяй.

У Віцебску школьнікі будуць гаварыць пра музеі, папулярнасць папяровых кніг і брэнд роднага горада як культурнай сталіцы. Па выніках абмеркавання журы, у склад якога ўвайшлі мясцовыя эксперты па вызначаных тэмах, прадстаўнікі кампаніі А1 і мясцовай супольнасці TEDx, абярэ найлепшыя выступленні, ідэі і ўзнагародзіць іх аўтараў.

Для таго каб натхніцца тэмай культуры і паглыбіцца ў яе, напярэдадні варкшопа арганізатары сацыяльна-адукацыйнага праекта «Першыя» выпусцілі другі эпізод беларускамоўнага падкаста для падлеткаў, які можна знайсці на сайце праекта. У гутарцы з вядучым Дзмітрыем Смірновым акцёр і рэжысёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Раман Падаляка расказвае, якія спектаклі варта наведаць моладзі, да каго звяртацца па дапамогу пры рэалізацыі праектаў у сферы культуры і як да іх рыхтавацца.

Да кожнага з наступных крэатонаў таксама будуць выходзіць новыя эпізоды падкаста, гаворка ў якіх пойдзе пра дзейнасць у галіне тэхналогій, экалогіі і інклюзіі.

«Першыя» — гэта рэспубліканскі конкурс ідэй, з дапамогай якіх можна змяніць навакольны свет, грамадства ці жыццё людзей да лепшага. Збор заявак яшчэ працягваецца. Прапанаваць сваю задуму да 8 сакавіка могуць вучні 9—11 класаў з усіх рэгіёнаў Беларусі.

Кожны ўдзельнік конкурсу распрацоўвае сваю ідэю, а для ўдзелу ў фінале будуць адабраны дзесяць старшакласнікаў. Кожны з іх атрымае прыз — iPhone Xs, а таксама пад кіраўніцтвам персанальнага ментара прадставіць сваю ідэю на маштабнай маладзёжнай канферэнцыі TEDxYouth@Minsk.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*У ліку найлепшых*

# «ЖЭСТАБОТ» І ЭФЕКТ КАРМАНА Ў ДЗЕЯННІ

## Набліжаецца да фіналу конкурс «100 ідэй для Беларусі»

**Завяршаецца дзявяты сезон рэспубліканскага маладзёжнага праекта «100 ідэй для Беларусі». З усіх абласцей краіны на яго паступіла больш за тысячу заявак, паведамілі ў ЦК БРСМ. У кастрычніку — лістападзе мінулага года прайшло 39 занальных адборачных этапаў, у якіх узялі ўдзел больш за паўтысячы маладых людзей, у снежні — шэсць абласных, Мінскі гарадскі і адборачны этап Нацыянальнай акадэміі навук.**


Аляксандр Глуткін.

У фінале, які, як чакаецца, пройдзе ў лютым, возьмуць удзел сто найлепшых праектаў. Сярод іх, напрыклад, сістэма падліку пасажыраў у грамадскім транспарце, распрацаваная прадстаўнікамі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Эдуардам Конанавым, Дзмітрыем Заваленым і Ільём Ваўком. Аўтары прапануюць устанаўліваць у аўтобусах камеры, дзякуючы якім можна будзе праводзіць ацэнку пасажырапатоку ў залежнасці ад часу сутак, пары года і іншых фактараў. Студэнты гэтай жа ВНУ Мікіта Юшкін, Аляксандра Купцова і Рычард Красноў прэзентавалі мабільную рэкламную платформу з гейміфікацыяй. Сутнасць праекта Virtual Me ў тым, што дзейнні з рэальнага жыцця будуць адлюстроўвацца на аватары ў праграме.

Студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі Мікіта Кудзінаў і Ілья Іваноў прапанавалі аўтарскі праект «Жэстабот». Гэта робат, які кіруецца жэстамі рукі. Ён можа быць выкарыстаны ў якасці маніпулятара для вырашэння задач у цяжкадаступных месцах, умовах, небяспечных для жыцця і здароўя. Спецыялісты Гомельскага вагоннага дэпо РУП «Гомельскае аддзяленне Беларускай чыгункі» Аляксандр Атока і Аляксей Лях распрацавалі методыку і стэнд аўтаматызаванага магнітапарашковага кантролю цэльнакатаных колаў пры бягучым і сярэднім рамонце колавых пар. Укараненне гэтага праекта дасць магчымасць цалкам адмовіцца ад ручной работы, павысіць яе прадукцыйнасць і, як вынік, — бяспеку руху пры перавозцы грузаў і пасажыраў.

Дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Аляксандр Глуткін — аўтар больш чым 120 навуковых і вучэбна-метадычных работ, пераможца конкурсу «100 ідэй для Беларусі» 2018 года і міжнароднага конкурсу «100 ідэй для СНД». Гэты ўдзельнік прадставіў праект «Інавацыйная гідрагелевая матрыца для вытворчасці ранавых павязак і касметычных сродкаў». Распрацоўка служыць эфектыўнай перашкодай для бактэрый, а таксама ратуе ад страты вільгаці ў арганізме, астуджае, абараняе, рэгенеруе. Пакрыццё лёгка накладваецца на рану і здымаецца з яе, не патрабуе валодання адмысловымі навыкамі. Яно на 40—50 працэнтаў танней за імпартныя аналагі.


Аляксандр Атока і Аляксей Лях.

Вучань 11 класа слуцкай сярэдняй школы № 11 Цімафей Стамброўскі прэзентуе праект «Выкарыстанне эфекту Кармана для атрымання аднаўляльнай энергіі». Ён стварыў мадэль бяспечнага ветрагенератара, які ператварае энергію ветру ў электрычнасць. Вучаніца 10 класа гэтай жа школы Лізавета Грынюк будзе ўдзельнічаць у фінале са сваёй распрацоўкай «Аўтаматычная сістэма прытокава-выцяжной вентыляцыі з рэкуперацыяй цяпла». Прылада здольная забяспечваць памяшканне прытокам цёплага і свежага паветра, яна створана з другаснай сыравіны, з мінімальнымі выдаткамі на зборку і эксплуатацыю. Акрамя таго, распрацавана мабільная праграма, якая не толькі кантралюе работу рэкуператара, але і сочыць за ўтрыманнем вуглякіслага газу ў памяшканні.

Вучні 11 класа асіповіцкай сярэдняй школы № 4 Дзяніс Ерашэвіч і Дзмітрый Барысаў прайшлі ў фінал з праектам, звязаным з комплекснай перапрацоўкай малочнай сыроваткі. Упор зроблены на комплекснае безадходнае выкарыстанне малочнай сыравіны, мадэрнізацыю і стварэнне новага тэхналагічнага абсталявання, вырашэнне праблем энерга- і рэсурсазберажэння, экалагізацыю малочнай вытворчасці. Навучэнец мінскай гімназіі № 38 Арсеній Жылко будзе змагацца за перамогу з праектам «Біяпалімерныя скафолды на аснове пекціну і хітазана для рэгенератыўнай медыцыны». Пекцін і хітазан з'яўляюцца прыроднымі палікукрыдамі з шырокім спектрам фізіялагічнай актыўнасці і належаць да аднаўляльных крыніц сыравіны. Праект цалкам адпавядае экалагічным патрабаванням. Акрамя таго, ён мае эканамічны эфект за кошт памяншэння выдаткаў на лячэнне і рэабілітацыю з-за скарачэння часу знаходжання пацыентаў у стацыянары.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота БРСМ.**

# У РАБОТАДАЎЦЫ ДЛЯ ВАС — 45 СЕКУНД...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Яшчэ летась Дар'я БУРЫКА была студэнткай факультэта міжнародных адносін БДУ. Тады, упершыню беручы ўдзел у «Кар'ерным форуме», яна запоўніла заяўку ў буйную міжнародную кампанію грузаперавозак Primum. А сёлета дзяўчына была на мерапрыемстве яе прадстаўніком і дзялілася ўражаннямі з іншымі: «Вельмі часта бываю ў камандзіроўках, выкарыстоўваю замежныя мовы кожны дзень, нават тыя, якія амаль не ведаю *(усміхаецца)*. Добра тое, што студэнты могуць прыйсці да нас як на першым курсе, так і на апошнім. Нават калі будучая прафесія не звязаная з лагістыкай, тут навучаць усяму з нуля. Галоўнае — штодзень удасканальваць сябе і свае навыкі».

Калі Wargaming праводзіць курсы для таленавітых геймераў і праграмістаў, сярэдні конкурс складае 15 чалавек на месца. І гэта нават не працаўладкаванне! Якія навыкі патрэбныя зацікаўленым юнакам і дзяўчатам і што рабіць, каб не заваліць сумоўе ў IT-кампаніі? Пра гэта расказаў студэнтам аналітык Wargaming Кірыл САЎЧАНКА.

— Што ў вас павінна прысутнічаць, калі збіраецеся на гутарку з наймальнікам? Бляск у вачах і жаданне працаваць менавіта ў той кампаніі, куды адпраўляеце заяўку. Аднак гэта не ўсё. Здзівіць работадаўца вы можаце выдатнымі тэарэтычнымі ведамі. Бо часта бывае, што патэнцыйныя маладыя спецыялісты не маюць вялікага практычнага вопыту за плячыма, а значыць, ім няма чым «абцяжарыць» сваё рэзюмэ, — зазначыў спікер.

Маладыя кандыдаты перад сумоўем павінны рыхтавацца да таго, што падчас



гутаркі прафесіяналы будуць задаваць ім шмат разнапланавых пытанняў:

— Калі не будзеце гатовы адказаць на іх або пакажаце няўпэўненасць у сабе, хутчэй за ўсё, вас не возьмуць. Парада ўсім — наведвайце профільныя курсы. Сістэма анлайн-адукацыі, якая цяпер прадстаўлена на рынку, дае добрыя магчымасці паглыбіцца ў любую тэму і нават папрактыкавацца. Адзін з самых надзейных спосабаў дасягнуць чагосьці ў сферы праграмавання — знайсці сабе ментара: чалавека, які мае вялікі вопыт у гэтым кірунку і можа падзяліцца сваімі ведамі з вамі.

Эксперт Wargaming развеяў папулярны міф, што для таго, каб працаваць праграмістам, профільная адукацыя не патрабуецца. «Без ведання дыскрэтнай матэматыкі, статыстыкі і лінейнай алгебры практычна немагчыма дасягнуць высокай пазіцыі ў кампаніі. Любому спецыялісту таксама неабходны набор камунікатыўных навыкаў. Гэтыя асобасныя кампетэнцыі не маюць дачынення да распрацоўкі або тэсціравання, але неабходныя для паспяховай работы ў камандзе».

...«Каб ацаніць ваша рэзюмэ, рэкрутар або HR-менеджар траціць не больш за 45 секунд. Калі яно не зачапіла — першасны адбор не пройдзены, а значыць, можна забыць пра запрашэнне», — упэўнена спецыяліст па рабоце з персаналам міжнароднай аўдытарскай кампаніі EY Наталля КАМЕЙША. Заяўкі на працаўладкаванне, магчымасць стажыроўкі студэнтаў яна разглядае штодзень і таму ведае, як правільна скласці рэзюмэ і пазбегнуць тыповых памылак.

— Па-першае, шукайце стыльныя канструктары, крэатыўныя рэсурсы для стварэння вашага «шэдэўра». Перад тым як пачаць яго рыхтаваць, даведайцеся як мага больш пра кампанію, куды накіроўваецеся, вакансію і супрацоўнікаў фірмы, каб на сумоўі вы змаглі падтрымаць гутарку і паказаць свае веды, зацікаўленасць да пэўнай пазіцыі. Не трэба ўказваць, якія курсавыя вы абаранялі, якія адзнакі за гэта атрымлівалі, — толькі тое, што сапраўды паўплывала на вас як на асобу і дало прафесійныя навыкі: праекты, валанцёрства, цікавыя конкурсы. Аднойчы мне даслалі рэзюмэ на 27 старонках. Зразумела, што я паглядзела толькі першую і апошнюю... Дарэчы, у раздзеле «Хобі» можаце пазначыць штосьці кшталту «вышываю крыжыкам»: тады становіцца зразумела, што вы ўседлівы, а значыць, зможаце выконваць руцінную работу, і, хутчэй за ўсё, вас можна ўзяць на пэўную вакансію, — падзялілася вопытам Наталля Камейша.

Тыповыя памылкі студэнтаў пры складанні рэзюмэ — нечытабельны шрыфт, такі як, напрыклад, Times New Roman (звярніце ўвагу на Kalibri, Arial), выкарыстанне маланаёмых тэрмінаў (аддайце перавагу простай мове), штампы кшталту «працавіты», «камунікабельны», «стрэсаўстойлівы» (калі ўключылі такое апісанне — растлумачце, дзе былі праяўлены гэтыя якасці). А яшчэ — нявывераная арфаграфія, незразумелая назва файла (пазначце ў ім сваё імя і прозвішча, можаце і пасаду, на якую прэтэндуеце), няправільнае ацэньванне ўзроўню ведання замежных моў (ніякіх «працую над гэтым» або «лепш не пытаць», толькі «B1» або «A2» і іншае). Маленькі сакрэт: калі дасылаеце рэзюмэ ў IT-кампанію, майце на ўвазе, што амаль заўсёды супрацоўнікі такіх фірмаў карыстаюцца тэхнікай Apple, якая «счытвае» толькі фармат pdf.

— Недарэчная памылка — указваць тое, што вы ўпэўнены карыстальнік ПК, маеце навыкі работы з інтэрнэтам. Парада ўсім — сачыце за назвай сваёй электроннай скрыні: калі яна нагадвае штосьці кшталту «Аліна Коцік-2017» або «Павел Супермен 1996», лепш яе змяніць, — раіць эксперт.

Напрыканцы спікер нагадала, што немалаважнай часткай удалага рэзюмэ з'яўляецца фота. Яно павінна быць дабраякасным. «Здымак лічыцца прымальным без аголенага цела, хатніх жывёл, іншых выяў на фоне — толькі ваш партрэт. Коцікі — гэта міла, але вы маеце шанц запомніцца работадаўцу не перспектыўным спецыялістам, а тым, «хто з коцікам на фота»...

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

*У актыўным рытме*

# СТАЦЬ «СТУДЭНТАМ ГОДА»,

## або Жыццёвае крэда дзяўчыны ў кедах

**Добра вучыцца і паспяваць займайцца хобі лёгка! Так лічыць дваццацігадовая Дар'я ПАЎЛОЎСКАЯ, студэнтка-чацвёртакурсніца Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Зусім нядаўна яна стала пераможцай рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года — 2019». Але гэта не адзінае дасягненне гераіні. Чым жа напоўнена яе жыццё?**



Фота БелТА.

— У дзяцінстве я любіла глядзець замежныя праграмы, з лёгкасцю цытавала некаторыя фразы і запаміналa песні на замежных мовах. Магчыма, гэта паўплывала на выбар ВНУ. Калі ўпершыню пераступіла парог свайго ўніверсітэта, зразумела: вось ён, наступны важны этап майго жыцця. Абрала факультэт славянскіх і германскіх моў, вывучаю англійскую, нямецкую, польскую, кітайскую, італьянскую мовы. Гэта дае мне шмат бонусаў, дапамагае ў розных жыццёвых сітуацыях. Пісаць штодзень канспекты і нешта зубрыць — не для мяне, аддаю вучобе прыкладна палову свайго часу, астатняя сыходзіць на цікавыя праекты і захапленні.

Наша суразмоўніца — старшыня студэнцкага навуковага таварыства ўніверсітэта, яна мае 27 навуковых публікацый і нават манаграфію! Разам з іншымі студэнтамі імкнецца папулярызаваць навуку, даказаць, што вывучаць яе зусім не сумна. Апроч таго, Дар'я — сакратар Маладзёжнага парламента пры Баранавіцкім гарадскім Савеце дэпутатаў. Да таго ж стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

— Маё жыццёвае крэда: калі бярэшся за штосьці, то рабі гэта добра. Да ўдзелу ў конкурсе «Студэнт года» я не ўмела маляваць. А для творчага нумара, дзе пад кавер уласнага выканання на «Зорку Венеру» Максіма Багдановіча трэба было «стварыць» выяву паэта, рызыкнула, і самой вельмі спадабалася! Для таго каб прыцягнуць увагу публікі, яшчэ падчас падрыхтоўкі да мерапрыемства мая каманда прыдумала розныя «фішкі», абапіраючыся на фільмы, кнігі, жыццёвы вопыт. Так, напрыклад, з'явілася задума з чамаданам. За аснову ўзялі вядомы фільм «Крымінальнае чтыво»... Увогуле, было складана канкурыраваць з іншымі ўдзельнікамі, бо яны былі са сцэнай на «ты», а я ніколі не танцавала, не спявала, не іграла на музычных інструментах. Падчас абласнога этапу ўпершыню выступала перад вялікай аўдыторыяй, вельмі хвалявалася, але на рэспубліканскім з'явілася ўпэўненасць у сабе, таму што была вялікая падтрымка з боку гледачоў, родных і іншых фіналістаў.

Дар'я ўпэўнена, што браць удзел у падобных конкурсах — важна для самаразвіцця.

— І не трэба забываць пра выйгрыш. У многіх на ўзбраенні выраз «галоўнае не перамога, а ўдзел». Гэта не пра мяне. Усе мы да чагосьці імкнёмся, а калі не бачым жаданага выніку, не разумеем, куды рухацца далей і ці варта ўвогуле... Часта кажу: ва ўсіх у жыцці ёсць аднолькавыя магчымасці, і нам застаецца толькі імі скарыстацца!

Дарэчы, сама суразмоўніца робіць гэта напоўніцу: займаецца арганізацыяй мерапрыемстваў, шмат фатаграфуе і падарожнічае. Але пра ўсё па парадку.

— Была ў Вялікабрытаніі, Славакіі, Балгарыі, Румыніі, Літве... Польшчу аб'ездзіла амаль усю. Часта падарожнічаю адна, тады можна самастойна выбраць маршрут, рухацца ў вызначаным рытме. З мінусаў — няма з кім падзяліцца атрыманымі эмоцыямі. Таму як блогер запісваю відэа для сяброў, якія чакаюць у Беларусі. Удзельнічаць у арганізацыі фестываляў пачала некалькі гадоў таму. Аднойчы ляжала на канапе і зразумела, што больш не хачу так праводзіць лета. І закруцілася: міжнародны рыцарскі фестываль сярэднявечнай культуры і музыкі «Наш Грунвальд», міжнародны купальскі фолк-фэст «Свята сонца», фестываль гісторыі і культуры «Мінск старажытны» і іншыя. Што датычыцца фатаграфавання, любоў да гэтай справы ўзнікла яшчэ ў дзяцінстве, у час плёначных апаратаў. Больш за ўсё мне падабаецца «лавіць» шчырыя эмоцыі людзей.

Некалькі гадоў таму гераіні пашчасціла апынуцца на навагоднім прэзідэнцкім балі. «Якія ўражанні?» — пытаюся ў яе.

— Падрыхтоўка аказалася складаная, але вельмі цікавая. Я з тых дзяўчат, якія амаль увесь час ходзяць у кедах, а тут трэба было стаць на абцасы, адзецца ў пышную сукенку. Але гэта было варта таго: на мерапрыемстве адчувала сябе асаблівай, вакол панавала атмасфера чараўніцтва...

Хоць Даша актыўна наведвае розныя гарады і краіны, заўсёды імкнецца дадому, у родныя Баранавічы:

— Мне тут падабаецца. Калі ахоплівае самота або хочацца спакою, іду ў мясцовую кавярню па любімы круасан з апельсінам, вяршкамі і арахісавай пастай — зарад энергіі мне забяспечаны! А яшчэ недалёка ад майго дома ёсць возера з невялікім пагоркам. Летам люблю сустракаць там світанак або чакаць заход сонца.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

*На сваім месцы*

# «ПРАФЕСІЮ ВЕЛЬМІ ЛЮБЛЮ. І ЛІЧУ, ШТО ГЭТА ЎЗАЕМНА!»

## Будні правізара ў фармацэ 24/7

**— Я загадчыца адной з кругласутачных сталічных аптэк «Белфармацыі», таму даводзіцца вырашаць пытанні ледзьве не 365 дзён у год, — ці то жартам, ці то ўсур'ёз расказвае правізар Віялета ЕРМАЛОВІЧ. — Сюды па размеркаванні прыйшла летась. Сама родам з Беразіна, скончыла Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт па спецыяльнасці «фармацыя». Навучальная ўстанова была абрана мною свядома, бо я з дзяцінства марыла толькі аб медыцыне. Таму ў ВНУ лёгка атрымлівалася сумяшчаць вучобу, навуковую і творчую дзейнасць, — дзеліцца суразмоўніца.**

Пачатак любові да медыцыны ў Віялеты звязаны з сумнай гісторыяй, якая адбылася з яе бабуляй...

— Калі мне было паўтара года, яна памерла ад анкалогіі. У маіх дзіцячых уяўленнях я была абавязана ў будучыні знайсці лекі ад раку. Калі стала дарослая, перакананні не зніклі. Спадзяюся, мне пашчасціць апынуцца ў якасці спецыяліста ў кантрольна-аналітычнай або выпрабавальнай лабараторыі і зрабіць важнае адкрыццё для многіх людзей. Яшчэ адзін успамін з тых часоў — заўсёды прасіла бацькоў купіць мне дзіцячыя наборы доктара, а таксама гумавыя мячыкі. Тата і мама здзіўляліся, чаму яны так хутка знікаюць, а я ціхенька маўчала, бо «лячыла» іх ад розных хвароб пластмасавым шпрыцам, ад чаго яны здзьмуваліся. Іншыя цацкі атрымлівалі ад мяне такую ж «тэрапію».

Цяпер, будуючы кар'еру, наш правізар дакладна адчувае сябе на сваім месцы. Дзяўчына адзначае, што ў яе рабоце галоўнае — гэта адказнасць, кампетэнтнасць і любоў да людзей. Самае прыемнае для маладога спецыяліста — бачыць удзячнасць у вачах наведвальнікаў, якім змагла дапамагчы...



**Падчас вучобы Віялета часта была вядучай розных мерапрыемстваў.**

— Бываюць цікавыя выпадкі. Часта прыходзяць са словамі: «Я не памятаю назву таблетак, што мне патрэбныя, але яны блакітненькія». А яшчэ часам прыязджаюць па лекі, якія параілі купіць... сябры або суседзі. Пытанне запісу на прыём да ўрача ў наведвальнікаў нават і не ўзнікае, бо, маўляў, знаёмыя ведаюць лепей. Але так ставіцца да свайго арганізма нельга, бо пасля прыёму самастойна прызначаных медыкаментаў могуць быць непрыемныя наступствы, — працягвае суразмоўніца.

У жыцці Віялета актывістка і выдатніца: вучылася ў школе мастацтваў, скончыла клас па фартэпіяна, сальфеджыа, танцавала ў балеце, хадзіла на тэатральныя курсы, наведвала розныя іншыя гурткі і секцыі. У студэнцкія гады дзяўчына была камандзірам валанцёрскага атрада, супрацоўнічала з паліятыўнымі цэнтрамі. Таксама публікавала навуковыя работы ў ВНУ, праводзіла канцэрты і конкурсы, была карэспандэнтам універсітэцкай газеты. Ды і цяпер наша гераіня не спыняецца ў самаразвіцці, займаецца шматлікімі праектамі. З апошніх — удзел у гарадскім конкурсе «Найлепшы малады спецыяліст года — 2019», дзе яна заняла другое месца ў намінацыі «Найлепшы малады спецыяліст установы аховы здароўя», а таксама ў рэспубліканскім «Валанцёр года — 2019».

Гераіня расказала, што падчас удзелу ў іх ніколькі не хвалявалася.

— А навошта? Усе, хто адпраўляе заяўкі на такія конкурсы, ведаюць уласныя магчымасці і тое, што хочуць сказаць сваім выступленнем. Дабрачыннасцю займаюся, колькі сябе памятаю. Такую пазіцыю абрала ўся мая сям'я. З дзяцінства бачыла жаданне дапамагчы, спачуванне з боку родных да іншых людзей і жывёл. Валанцёрства ахоплівае розныя кірункі. Гэта і наведванне дзіцячых дамоў, і ўдзел у розных мерапрыемствах: дабрачынных канцэртах (Віялета дагэтуль штогод з'яўляецца вядучай аднаго з такіх ва ўніверсітэце), выстаўках і многім іншым, што прыносіць карысць тым, хто мае патрэбу. Спадзяюся, што мае самыя знакавыя падзеі ў валанцёрскай дзейнасці яшчэ наперадзе, — зазначыла дзяўчына.

— Калі пісалі навуковыя работы ў медуніверсітэце, якія тэмы вас хвалявалі больш за ўсё?

— Іх так многа, што згадваць давядзецца доўга. Самая дарагая майму сэрцу закранала развіццё хоспісаў у краіне. Калі збірала звесткі, размаўляла з рознымі людзьмі і разумела, што многія не ведаюць, што такое паліятыўная медыцына. Лічу, так быць не павінна, таму не пакінула задуму толькі на паперы, а ператварыла яе ў сацыяльны праект. На базе спецыялізаванага дома дзіцяці працуе паліятыўны цэнтр у Віцебску. Ужо шэсць гадоў там дзейнічае акцыя «Заўсёды выратавальнае дабро», якую я заснавала.

Віялета — доўгачаканае дзіця для сваіх бацькоў. Мама, педагог з трыццацігадовым стажам, выхоўвала дзяўчыну ў строгасці, аднак не павышаючы голас, а размаўляючы на роўных. Тата, больш мяккі чалавек, песціў любімую дачушку, але заўсёды паўтараў, што толькі яна сама нясе адказнасць за свае рашэнні.

— Родныя ці сябры крыўдзіліся за тое, што вы вельмі шмат часу праводзіце на рабоце?

— Яны заўсёды мяне падтрымліваюць, бо разумеюць, што сапраўды амаль не бываю вольная. Я вельмі камунікабельны чалавек, аднак цаню свой асабісты час, якім распараджаюся рацыянальна. Не хаджу на свецкія мерапрыемствы, на якія мяне перыядычна запрашаюць, не сустракаюся з сябрамі ў кавярні. Удалае планаванне — гэта тое, што дапамагае мне дасягаць сваіх мэт. Абраную прафесію вельмі люблю. І лічу, што гэта ўзаемна!

Ад Віялеты дазналіся, што яе хобі — напісанне вершаў, заняткі жывапісам, роспіс тканін, захапленне псіхалогіяй і гістарычнымі раманамі... Спіс можна працягваць доўга! З апошняга — навучанне ў расійскім філіяле «Федэральнай школы радыё», якое дзяўчына распачала паўгода таму.

— Калі ўсё бяжыць у такім рытме, і ты бяжыш. Упэўнена, што чым менш вольнага часу, тым больш ты паспяваеш, — лічыць дзяўчына.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

## Канстанцін КАСЯК



**Канстанцін Касяк — самы даўні калумніст часопіса «Маладосць»: яго «Крэскі жыцця» выходзяць штомесяц з 2016 года. Але гэтым разам часопіс друкуе яшчэ і прозу аўтара — упершыню пасля дэбюту ў 2013 годзе. Ну як прозу? Рэалістычныя нататкі.**

### СТРАХ

— Ці пішаш нешта? — пытае нечакана сябар за куфлем піва.

Звычайна мне не задаюць такіх пытанняў. Бывае, я нават сумняваюся ў тым, што хтосьці наогул чытае мае тэксты. Таму зняважліва называю іх пісулькамі.

Мы сядзім у звычайным мінскім бары, гаворым пра неабавязковыя рэчы. Позні вечар, спакойная атмасфера, нікога больш. Побач завіхаецца афіцыянтка, ладненькая такая дзяўчына гадоў дваццаці. Рыхтуецца да закрыцця. А я на пытанне таварыша адказаць не спяшаюся. Спачатку трэба адказаць сабе самому.

Вядома, я пішу. Шмат. Публікую, праўда, мала. У асноўным публіцыстыку — артыкулы на сайтах і калонку ў часопісе. Усё астатняе — у стол. Чаму? Відаць, баюся. Чаго? Простых рэчаў. Не вельмі хацелася б быць засмяяным, неапублікаваным, непатрэбным, нягеглым, нявартым. Працягваць можна бясконца.

Страх — гэта вельмі моцны інстынкт. Ён можа перавышаць здаровы сэнс. І так і павінна быць, у прынцыпе. Але ў некаторых рэчах варта ўсё ж сябе пераадольваць. Бо ў іншым выпадку што застанецца? Спісаныя абразкамі сшыткі ды дзённікі. А каму яны будуць патрэбныя, калі аўтар ноўнэйм? Ды нікому! Хаця бывае, што і тэксты вядомых аўтараў забываюцца. Я такіх занядбаных багоў еўрапейскай літаратуры ведаю. Але паўтарыць іх лёсы не хацеў бы.

— Хлопцы! Толькі вас чакаем! — кажа ладненькая афіцыянтка і ўсміхаецца. — Мы закрыліся!

Наперадзе бязлюдны сонны Мінск.

### ТУМАН

Даўно такіх туманаў не бачыў, каб увесь горад завалакло і ён ператварыўся ў прывід. Як з фільмаў жахаў. Тым больш каб адбывалася гэта ўзімку. Каторы год нешта не тое з надвор'ем...

Я заблукаў, вяртаючыся дамоў. Не адразу зразумеў, у якім баку жыву. А такое рэдка бывае са мною, з дзяцінства добрая памяць.

Раней я любіў туман. Калі ён спускаўся на Нёман, то мы, малыя падшыванцы, беглі да яго і забаўляліся на беразе да цемры. Пужалі адно аднаго. Самы эфектны спосаб — знайсці ўжо раскладзенае кімсьці вогнішча ды нацягаць з яго вугалькоў. Неблагія вочы монстра могуць атрымацца. А яшчэ мне падабалася, калі мы збіраліся каля агню ды распавядалі адно аднаму страшныя гісторыі. Часам досыць банальныя, як песні папулярнага ў той час «Караля і шута», але вяртацца дамоў потым было ўсё адно страшна.

Зараз мяне такім, натуральна, не ўразіш. Пэўна, цяпер не здзівіўся б, калі б сустрэў таго монстра з пякельнымі вачыма на вуліцы. Так і ўяўляецца ён мне — вялізны такі, большы за мяне, чорны чалавек з вачыма, якія палаюць. Выходзіць з туману і моўчкі павольна крочыць у мой бок...

Але ў горадзе было пуста. Пахла свежасцю і цеплынёй. Рэдкія машыны не давалі застацца ў абсалютнай адзіноце. Горад усё яшчэ абжыты, і ў ім ёсць людзі.

Зноў я так нікога і не сустрэў...

### КАНЦЭРТ

Многія здзіўляюцца, калі я гавару, што люблю малалюдныя канцэрты. На пару дзясяткаў чалавек, не болей. І яшчэ каб знаёмыя былі не толькі ў зале, але і на сцэне. Ідэальны варыянт — акустыка. Тады музыка не напружвае, але дапамагае занурыцца ў сябе. Здаецца, ты разам з людзьмі, але ўсё ж адзін.

Сесці за вольны столік, замовіць сабе кавы, гарбаты, а можа, і чаго мацней. Усё залежыць ад настрою. Побач падсаджваецца адзін з музыкаў. Вітаемся, гаворым, зараз ён пойдзе рыхтавацца да выступлення. Тым часам на сцэне два хлопцы ўжо граюць чыкагскі блюз. Іх спевы, гітары і губны гармонік пераносяць у атмасферу 1920-х. Прынамсі, мне ўяўляецца менавіта гэтая эпоха, калі чую блюз або джаз. Вірлівы быў час!

Слухаючы, магу і напісаць нешта. Ад нядаўняга часу пішу толькі ў праграме на смартфоне. Раней больш падабалася папера, як Петэру Хандке, — нобелеўскі лаўрэат таксама нібыта ўсё піша ад рукі. Пісаць ад рукі карысна, але справа вельмі непрактычная — потым жа яшчэ і набіраць даводзіцца. У тым ліку і з гэтай прычыны ў мяне без патрэбы ляжаць спісаныя сшыткі. Лянота. Не хочацца да іх вяртацца. Кожны раз адкладаю набор і рэдактуру «на потым», але цяпер думаю, што гэтае «потым» можа ніколі ўжо і не настаць.

Музыка — вечная катэгорыя. Нават калі цябе даўно няма, яна будзе працягваць сваё жыццё. Твае песні падхопяць іншыя. Тое самае з кнігамі, карцінамі і фільмамі — існуеш, пакуль ёсць запатрабаванасць і цікавасць. Гэта і ёсць шлях у вечнасць.

## Кацярына КАСЦЮШКА

# Шчаслівая БУДУЧЫНЯ



**Аўтарка лічыць, што незвычайныя гісторыі здараюцца з кожным — трэба толькі прыкмячаць іх.**

— ЕДУЦЬ! — ускрыкнуў святочна апрануты хлопчык гадоў пяці, узбягаючы па сходках на веранду.

— І сапраўды едуць, — глянула я ў акно. Азірнулася: сярод блакітных, мятных, пяшчотна-фіялкавых убораў толькі адна сукенка была белая. І толькі адзіны твар сярод агульнай весялосці выглядаў усхваляваным. Нявесцін.

— Воля, ідзі, не месца табе на парозе!

Тая ўсміхнулася і, падабраўшы вэлюм, пайшла ў пакой — хутка там будзе яе прынц.

— Ну што, дружкі! Памятайце, Волька ў нас адна. Але пастарайцеся не абабраць маладога да ніткі, можа спалохацца, — дзяўчаты зарагаталі і выйшлі на вуліцу.

Я зірнула ў люстэрка, паправіла доўгую ружовую сукенку і ўзяла са століка кошык з атрыбутамі для выпрабавання маладога. Яшчэ ў ім ляжалі кветачкі, якія ўжо праз паўгадзіны мае юныя прыяцелькі прышпіляць да пінжакоў дружак. А я, сведка, да пінжака таго, з кім мне прыйдзецца весці вяселле.

Узброіўшы найлепшай усмешкай, выйшла насустрач гасцям, якія ўжо паспелі адкупіцца ад «брамы» суседзяў. Жаніховы сябры гаманілі, жартам патрабавалі аддаць нявесту адразу, без гэтых камедый і катаванняў. Нашы ж дзяўчаты ўсміхаліся, перагаворваліся, хто каму прыглянуўся, сачылі вачыма за ўпадабанымі хлопцамі.

Святочная працэсія, наперадзе якой ішоў малады — Генка, — наблізілася, і я прывітала гасцей. Штосьці гаварылі сваты, штосьці адказвалі дружкі. Нарэшце я ўбачыла сведку. Убачыла — і ледзь не страціла прытомнасць: перада мной стаяў Выдрык — маё першае каханне, з якім і мы маглі б зладзіць вяселле. Але не зладзілі.

Выдрыкам Косцю «ахрысціла» мая мама. Ёй не падабалася яго прозвішча — Выдра: «Ну чаму яно такое непрыгожае? У маіх родных мясцінах, калі каго абразіць ці раззлаваць хацелі, так і казалі: «Ну ты і выдра!» Ужо б хоць які Выдрык». Так і звыкліся: Косцік, Костусь, а за вочы — Выдрык.

Пад такім імем ведала Косціка і Волька. Таму, калі Генка сказаў, што сведкам з яго боку будзе нейкі далёкі сваяк Канстанцін, сяброўка мая нават не скумекала, з якой іроніяй лёс зводзіць мяне з носьбітам гэтага рэдкага ў нашы дні імя. Справа ў тым, што для Гены было прынцыпова, каб яго сведка быў католікам. А высветлілася, што ўсе Генкавы таварышы ды стрыечныя браты або хрышчоныя ў праваслаўі, або жанатыя, або наадварот — замаладыя для такога даручэння. Жаніх ужо быў і не рады, што пайшоў на прынцып, але, на шчасце, згадаўся Косця — пляменнік далёкай сваячкі Зосі. Хлопец, як казалі, быў абыякавы і да царквы, і да касцёла. Генку нічога не заставалася, як згадзіцца.

І вось перада мной стаяў Выдрык. І, здаецца, здзіўлены не менш за мяне. Ён не мог ведаць, што яго сваяк сустракаецца з маёй школьнай сяброўкай, бо яны пазнаёміліся ўжо пасля нашага з Косцем расстання.

Калі Генка ўвайшоў у дом, да мяне падскочыла другая школьная сяброўка — Верка. Ёй ніколі не падабаўся Косця. Яшчэ ў той цёплы восеньскі вечар, калі ён упершыню прапанаваў правесці дадому, Верка адвяла мяне ўбок і насцярожана прагаварыла: «Калі не хочаш з ім ісці, скажу, што сёння ты начуеш са мной». Не скарысталася я тады прапановай сяброўкі...

— Спраўлюся, — сказала я Веры. Але сяброўка глядзела рашуча: адзін няправільны Косцеў рух — і гэты дзень ён запомніць назаўсёды.

Пакуль сват зачытваў «вянок», я, як у тумане, уплятала Вольцы пад вэлюм галінкі мірты: перад вачыма плылі вобразы мінулага кахання, якое скончылася так дзіўна. Не было ні сваркі, ні абразы, ні здрады. Проста неспадзявана Косця вырашыў скарыць сталіцу. А мяне ў гэтае бясконцае падарожжа не запрасіў. Я здзівілася, абурылася і, замест таго каб паабяцаць чакаць яго да канца сваіх дзён, спытала: «Гэта канец?» Выдрык толькі моўчкі пацiснуў плячыма. «Ну, то здзяйснення ўсіх мар», — абыякава сказала я і, не аглядаючыся, пайшла. Ён не затрымліваў і не прасіў вярнуцца.

Пасля да мяне даходзілі чуткі, што ў Мінску ён уладкаваўся на добрую работу, купіў кватэру і машыну. Чула і аб тым, што ён збіраецца жаніцца. «Усяму свой час!» — з усмешкаю адказвала я плеткарам. Але душою крывіла: мне было балюча. Бездань, утвораную незразумелым расстаннем, не знаходзіла чым запоўніць. І тут выяўляецца — не ажаніўся! А можа... і ён пакутуе без мяне? Надзея, кажуць, памірае апошняя, але магіла маёй ужо даўно парасла травой.

* * *

Вядоўца, безумоўна, нават не здагадваўся, у якім мы апынуліся становішчы: нам з Косцем давялося ўдзельнічаць ва ўсіх конкурсах. Разам. Я, як магла, цярпела, але калі пачалі крычаць «горка сведкам», не вытрымала. І так цэлы вечар я сядзела каля гэтага здрадніка — глянуць яму ў твар яшчэ раз я не здолела. Вяселле вяселлем, але з мяне хопіць.

Не зважаючы на крыкі залы, я ўстала і ўпэўненым крокам выйшла на двор. Мне хацелася знайсці хоць якую лаўку, каб прысесці, супакоіцца і абдумаць тое, што здарылася. Пасёлак быў незнаёмы — і я дайшла да самай ускраіны, да ракі. На шчасце, тут была альтанка. Я прасядзела мо з паўгадзіны, злуючыся на сябе за тое, што не здолела прыхаваць пачуццяў. І раптам здрыганулася — пачула яго голас. Вырашыла не азірацца.

— Я ведаў, што ты пойдзеш да ракі, — ціха сказаў мне першыя за гэты дзень словы.

— Не ведала, што тут ёсць рака, — стрымана адказала я. У той момант адчувала сябе абражанай Скарлет О'Харай.

— Віка, паслухай, я не хацеў цябе пакрыўдзіць.

— Навошта ты прыйшоў?! — рэзка павярнулася да яго. Мой позірк яго спалохаў.

— Віка, я не ведаў, што так атрымаецца. Я нават уявіць не мог, што нявеста — Воля. Калі б ведаў, ніколі б не згадзіўся...

— Пры чым тут Воля? Пры чым тут сёння! — крычала я. — Ты знік! Знік! — і слёзы градам сыпалі з маіх вачэй.

— Віка, мілая, Віка... — разгубіўся ён.

— Мілая?! Прэч, прэч адсюль!

І ён пайшоў. Так, як і тры гады таму. Не змагаўся, ні на чым не настойваў... Але раптам — у той дзень усё адбывалася нечакана — павярнуўся да мяне і пайшоў насустрач.

— Не, я не магу так проста пайсці. Я павінен аддаць тое, што належыць табе, — і ён уклаў мне ў далонь залаты пярсцёнак з блакітным каменьчыкам у форме сэрца. Менавіта такі заручальны пярсцёнак я ўяўляла з дзяцінства. О, як я ўзрадавалася б такому падарунку некалькі гадоў таму! Цяпер жа было толькі абурэнне.

Па скамянелым выразе твару і нервова дрыжачым вуснам Косця здагадаўся, што зараз пачнецца страшнае, і паспяшаўся гэта апярэдзіць:

— Дарагая, — стараўся, як умеў, супакоіць мяне, — гэты пярсцёнак я нашу з сабой ужо пяць гадоў. Гэта твой, толькі твой пярсцёнак. Я не аддам яго нікому іншаму. І прапаную, што робяць з такім падарункам... Віка, будзь маёй жонкай!

Як?! Як можна насіць пярсцёнак у кішэні і не прапанаваць шчаслівую будучыню, а проста з'ехаць? А цяпер, праз столькі часу, з'явіцца, як быццам нічога не здарылася, і бессаромна прапанаваць замужжа?! Што робіць гэты вар'ят?

— Не, — сабраўшы рэшткі мужнасці і годнасці, спакойна, але рашуча адказала я. Бо ведала: мне шчаслівую будучыню не абяцаюць.

## Извещение о проведении 27 января 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

| Предмет торгов |
|---|
| «Трансформаторная подстанция» общей площадью 42,7 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-50676; «складское помещение» общей площадью 15,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-50677; «производственно-бытовой корпус» общей площадью 118,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-50678 (составные части и принадлежности: проездная часть, ограждение, ворота, калитка, ворота); «устройство моечного отделения щебня» общей площадью 589,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-63932; асфальтосмесительная установка ДС-185 (инв. № 620); агрегат мокрой очистки щебня (инв. № 762); емкость 10 м³ (битум, инв. № 847); емкость 20 м³ (битум, инв. № 848); емкость 20 м³ (битум, инв. № 849); весы RV 3102 (инв. № 862); бункер приемный (инв. № 763); система видеонаблюдения (инв. № 0163); передвижное общежитие (инв. № 73); узел 1 подачи ж/с и щебня/конвейер 9 мп (инв. № 764); узел 2 подачи ж/с и щебня/конвейер 12 мп (инв. № 765); холодильник МИНСК 11 (инв. № 778); зеленые насаждения: липа № 22 (инв. № 918); тополь № 10 (инв. № 906); тополь № 9 (инв. № 905); сосна № 14 (инв. № 910); сосна № 15 (инв. № 911); сосна № 17 (инв. № 913); береза № 1 (инв. № 897); береза № 11 (инв. № 907); береза № 12 (инв. № 908); береза № 13 (инв. № 909); береза № 16 (инв. 912); береза № 18 (инв. № 914); береза № 19 (инв. № 915); береза № 2 (инв. № 898); береза № 20 (инв. № 0916); береза № 21 (инв. № 917); береза № 3 (инв. № 899); береза № 4 (инв. № 0900); береза № 5 (инв. № 901); береза № 6 (инв. № 902); береза № 7 (инв. № 903); береза № 8 (инв. № 904) |
| Местонахождение: Витебская область, Витебский район, Новкинский с/с, д. Куковячино |
| Площадь земельного участка: 2,6274 га, кадастровый номер: 221287000010000001 |
| **Начальная цена: 208 219,68 бел. руб. с учетом НДС** |
| Сумма задатка: 20 000,00 бел. руб. |
| Обременение: аренда |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателем) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **27 января 2020 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 16.01.2020 по 23.01.2020** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ № 7»).

---

Страховые полисы ОСГО ВТС РБ серии НА № 0674431, ВВ 7268425-7268432, 2438350, 7239977, 4831504-4831508, ВЕ 0227317 страховой компании ЗАСО "Промтрансинвест" **считать недействительными в связи с утерей.**

УНП 100357923

---

## ОБЪЯВЛЕНИЕ об электронных торгах

Государственное предприятие **«БелЮрОбеспечение»** (УНП 192821149) объявляет о проведении торгов:

лот № 7.2020.02.00013: Suzuki Aerio, 2003 г. в., принадлежащий **Шерневич Светлане Николаевне,** находящийся в г. Минске, начальной стоимостью 2300,00 бел. руб.

**Торги будут проведены 04.02.2020 (с 9.00 до 18.00) на сайте e-auction.by.**

Задаток в размере – 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 16.00 03.02.2020 на депозитный счет отдела принудительного исполнения Советского района г. Минска, BY10AKBB36429000053215300000, филиал 514 ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY21514, УНП 100223493.

Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы».

---

## ЗАО «Белреализация» объявляет об аукционе

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

**Продавец:** СООО «Копыльское Производство Строительных Систем» (УНП 690653993), в лице управляющего по делу о банкротстве индивидуального предпринимателя Залуцкой А. Л., тел. +37544 714-84-18.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **31 января 2020 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Шаг торгов / задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Асфальтобетонная площадка № 2 (с инв. № 642/С-14755 (д. Тимковичи), пл. 2906 кв. м), бытовое помещение, ворота раздвижные двухстворчатые 430 кг, здание склада з/частей (кап. строение с инв. № 642/С-12117, пл. 2160 кв. м, трап для заезда погрузчика в вагон 0,5 т, по адресу: Минская обл., Копыльский р-н, д. Тимковичи | 207 546,67 | 10 377,33 |
| 2 | Комплекс зданий (цех резинно-технических изделий, инв. № 642/С-11857 пл. 3957,8 кв. м, котельная, инв. № 642/С-16979 пл. 332,9 кв. м), коммуникаций и промышленного оборудования для производства пенополистерола, по адресу: г. Копыль, ул. Партизанкская, д. 32 | 914 065,24 | 45 703,62 |
| 3 | Ангар (кап. строение с инв. № 642/С-12107, пл. 181 кв. м), здание мебельного цеха, деревообрабатывающее оборудование, по адресу: Минская обл., Копыльский р-н, Копыль, ул. Партизанская, д. 32а/1 | 488 371,93 | 24 418,60 |
| 4 | Бытовое помещение цеха РТИ (кап. строение с инв. № 642/С- 24549, Минская область, г. Копыль, ул. Партизанкская, д. 32, пл. 632,7 кв. м) | 197 580,24 | 9879,01 |
| 5 | Бетоносмеситель СБ-242-5, Украина | 13 455,00 | 672,75 |
| 6 | Вибрационный грохот многочастотный двухдечный ULS 2,8*1/2 | 119 600,00 | 5 980,00 |
| 7 | Металлосклад (кап. строение с инв. № 642/С-16982, Минская обл., г. Копыль, ул. Партизанкская, д. 32, площадь: 108,2 кв. м) | 8644,14 | 432,21 |
| 8 | Гараж (кап. строение с инв. № 642/С-16980, Минская обл., г. Копыль, ул. Партизанкская, д. 32, площадь: 66,2 кв. м) | 7546,47 | 377,32 |
| 9 | Проходная (кап. строение с инв. № 642/С-12109, Минская обл., г. Копыль, ул. Партизанкская, д. 32, пл. 140,8 кв. м), ворота механические, благоустройство (сооружение с инв. № 642/С-16989, инв. № 642/С-16988 с составными частями и принадлежностями: покрытие асфальтобетонное и грунтовое), беседка | 126 955,45 | 6347,77 |
| 10 | Мойка для автотранспорта (литер А), Минская обл., г. Копыль, ул. Партизанская, 32 | 1619,05 | 80,95 |
| 11 | Здание заправки, здание склада обменного пункта с пристройками и благоустройством, Минская обл., Копыльский р-н, Тимковичский с/с, д. Тимковичи | 184 012,05 | 9200,60 |
| 12 | Комплекс зданий и оборудования для производства сухих строительных смесей, Минская обл., г. Копыль, ул. Партизанская, 32 | 517 748,87 | 25 887,44 |
| 13 | Комплекс зданий и оборудования для производства краски, Минская обл., г. Копыль, ул. Партизанская, 32 | 134 901,36 | 6745,07 |
| | Подробнее с составом лотов можно ознакомиться на beltorgi.by, тел. для ознакомления +37529 698-53-53 | | |

**Для участия в торгах необходимо в срок с 16.01.2020 г. 09.00 по 30.01.2020 г. 17.00:** 1. Зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY.** 2. Перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854591039330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение пяти дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 19.11.2019 г.

---

## ОБЪЯВЛЕНИЕ об электронных торгах

Государственное предприятие **«БелЮрОбеспечение»** (УНП 192821149) объявляет о проведении торгов.

**Имущество, принадлежащее ОАО «Белгран», находящееся в г. Минске, ул. Радиальная, 11А:**

лот № 7.2020.02.00003: кап. строение, инв. № 500/D-708145689, площадью 824,7 кв. м, начальной стоимостью 536 000,00 бел. руб.;

лот № 7.2020.02.00004: станок камнеобрезной алмазный канатный SUPERSA Q, начальной стоимостью 17 000,00 бел. руб.;

лот № 7.2020.02.00005: станок камнеобрезной СМР-015, начальной стоимостью 3700,00 бел. руб.;

лот № 7.2020.02.00006: станок камнеобрезной МР-600, начальной стоимостью 3900,00 бел. руб.;

лот № 7.2020.02.00007: пила канатная, начальной стоимостью 8800,00 бел. руб.

Ограничения (обременения): арест судебного исполнителя.

**Торги будут проведены 04.02.2020 (с 9.00 до 18.00) на сайте e-auction.by.**

Задаток в размере – 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 16.00 03.02.2020 на депозитный счет ОПИ УПИ Мингорисполкома, р/с BY56AKBB36429000024450000000, ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 100223493.

Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы».

---

## ОБЪЯВЛЕНИЕ о повторных электронных торгах

Государственное предприятие **«БелЮрОбеспечение»** (УНП 192821149) объявляет о проведении повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Песковское»,** находящегося в д. Пески, а именно:

лот № 1.2020.02.00001: грузовой автомобиль МАЗ-555142, 2009 г. в., начальной стоимостью 7338,14 бел. руб.;

лот № 1.2020.02.00002: грузовой автомобиль МАЗ-543302, 2006 г. в., начальной стоимостью 2071,02 бел. руб.;

лот № 1.2020.02.00003: грузовой автомобиль ГАЗ-5312, 2002 г. в., начальной стоимостью 819,69 бел. руб.;

лот № 1.2020.02.00004: грузовой автомобиль ГАЗ-Купава 23252, 2002 г. в., начальной стоимостью 2023,60 бел. руб.;

лот № 1.2020.02.00005: грузовой автомобиль ГАЗ-33021, 1999 г. в., начальной стоимостью 1346,62 бел. руб.;

лот № 1.2020.02.00006: прицеп МАЗ-857100, 2009 г. в., начальной стоимостью 3466,86 бел. руб.;

лот № 1.2020.02.00007: полуприцеп МЖА-6, 1989 г. в., начальной стоимостью 415,84 бел. руб.,

**Торги будут проведены 04.02.2020 (с 9.00 до 18.00) на сайте e-auction.by.**

Задаток – 10 процентов от стоимости лота зачисляется до 16.00 03.02.2020 на счет ОПИ УПИ главного управления юстиции Брестского облисполкома, BY48AKBB36429000026751000000, в ф-ле № 100 (г. Брест) ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21100, УНП 200019773.

Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы».

---

## ОБЪЯВЛЕНИЕ об электронных торгах

Государственное предприятие **«БелЮрОбеспечение»** (УНП 192821149) объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Гомельский радиозавод»,** находящегося в г. Гомеле:

лот № 3.2020.02.00001: пресс двухкривошипный К-3732, начальной стоимостью 4500,00 бел. руб.;

лот № 3.2020.02.00002: пресс кривошипный КД 2326, начальной стоимостью 1900,00 бел. руб.;

лот № 3.2020.02.00003: пресс кривошипный К2130В, начальной стоимостью 2800,00 бел. руб.;

лот № 3.2020.02.00004: пресс кривошипный КД2126Е, начальной стоимостью 1900,00 бел. руб.;

лот № 3.2020.02.00005: пресс однокривошипный КД2114А, начальной стоимостью 2700,00 бел. руб.;

лот № 3.2020.02.00006: пресс кривошипный КД2324Е, начальной стоимостью 1100,00 бел. руб.;

лот № 3.2020.02.00007: пресс однокривошипный КД2322Г, начальной стоимостью 1900,00 бел. руб.;

лот № 3.2020.02.00008: пресс кривошипный инв.№1909, начальной стоимостью 830,00 бел. руб.;

лот № 3.2020.02.00009: пресс кривошипный КД2122Е, начальной стоимостью 1800,00 бел. руб.;

лот № 3.2020.02.00010: пресс кривошипный КД2318, начальной стоимостью 830,00 бел. руб.;

лот № 3.2020.02.00011: пресс кривошипный КД2124, начальной стоимостью 2000,00 бел. руб.;

лот № 3.2020.02.00012: пресс кривошипный инв.№555551007/214, начальной стоимостью 2000,00 бел. руб.;

лот № 3.2020.02.00013: машина для внесения минеральных удобрений МТТ-4У, принадлежащая **ОАО «Имени Жукова»,** находящаяся в Брагинском р-не, аг. Бурки, начальной стоимостью 2400,00 бел. руб.;

лот № 3.2020.02.00014: здание неустановленного назначения, инв. № 350/С-141731, площ. 641,0 кв. м, принадлежащее **РТУП «Белорусское речное пароходство»,** находящееся в г. Гомеле, ул. Подгорная, 10, начальной стоимостью 55 700,00 бел. руб.

**Торги будут проведены 04.02.2020 с 9.00 до 18.00 на сайте: e-auction.by.**

